Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЖНІЎНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 154 (29523)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА



БЕЛАРУСКІХ ПАРААЛІМПІЙЦАЎ ПРАВОДЗІЛІ Ў ТОКІА 4

ЖЫХАРЫ НЕБА, ЯКІЯ АПЫНУЛІСЯ НА ЗЯМЛІ 21



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Калі Прэзідэнтам на рэспубліканскім педсавеце будуць падтрыманы прапановы па ўдасканаленні сістэмы адукацыі, то ўсе змяненні ўвойдуць у сілу да 1 верасня 2022 года. Прапановы Мінадукацыі неаднаразова разглядаліся ва ўрадзе, на пасяджэнні рэспубліканскага савета рэктараў, нарадах з удзелам разнастайнага кола зацікаўленых: педагогаў, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, якія вядуць грамадскія аб'яднанні, бацькоў. Таксама ў чэрвені 2021 года праведзены парламенцкія слуханні на тэму «Нацыянальная сістэма адукацыі: стан, заканадаўчае рэгуляванне, шляхі ўдасканалення». Такім чынам, выпрацаваныя падыходы да ўдасканалення сістэмы адукацыі ўжо дастаткова выверaныя, комплексна прапрацаваныя і падтрыманыя не толькі педагагічнай супольнасцю, але і шырокім колам грамадскасці».*

З першых вуснаў

# «МЫ З КАРАНАВІРУСНАЙ БЯДОЙ СЁННЯ СПРАЎЛЯЕМСЯ НА ГОДНЫМ УЗРОЎНІ»



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў віцебскую кампанію «Белвітуніфарм», якая будзе ствараць айчынную вакцыну супраць каранавіруса. Па словах кіраўніка краіны, дадзеная вытворчасць дасць велізарны імпульс для развіцця не толькі Віцебшчыны, а і ўсяго паўночнага рэгіёна.**
**Акцыянернае таварыства «Белвітуніфарм», размешчанае ў Віцебскім раёне, — адно з вядучых па стварэнні ветэрынарных прэпаратаў у краіне. У асартыменце каля 150 лекавых сродкаў для жывёл. Гэта забяспечвае палову патрэбнасці краіны. Падчас візіту на прадпрыемства кіраўнік дзяржавы заслухаў даклады чыноўнікаў, азнаёміўся з магутнасцямі кампаніі і перспектыўнай адкрыцця новых цэхаў. На парадку дня таксама была нарада па пытаннях распрацоўкі супрацьвірусных вакцын.**

СТАР. 2

Добрая навіна

# «НА ВЫРАТАВАННЕ БЫЛІ НАКІРАВАНЫЯ КАЛАСАЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ»

### Карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з маці і землякамі хлопчыка, які атрымаў жудасныя апёкі і якога нашы ўрачы вярнулі да жыцця



**Драматычныя гісторыі 16-гадовага Вадзіма Пальчанкі з Мсціслаўскага раёна і 12-гадовага Рамана Кагадоўскага з Мядзельшчыны, якія ў красавіку гэтага года на працягу невялікага адрэзка часу атрымалі моцныя апёкі — адзін падчас рыбнай лоўлі, калі зачапіўся вудай за электрычны дрот, другі — пры ратаванні малодшага брата на пажары — нікога не пакінулі абыякавымі. Дзеці, лічы, былі на мяжы жыцця і смерці, бо плошчы апёкаў складалі больш за палову паверхні целаў. Прэзідэнт асабіста ўзяў пад кантроль іх лячэнне. І вось прыемная навіна: стан Рамана Кагадоўскага ўдалося стабілізаваць, а Вадзім Пальчанка ўжо дома!**

Людміла РЫБЧЫНСКАЯ — маці Вадзіма, працуе аператарам на Ходасаўскім паштовым аддзяленні, але цяпер у дэкрэтным водпуску. У яе другі шлюб — акрамя старэйшага Вадзіма, у сям'і выхоўваецца шасцігадовы сын Арсеній, а хутка народзіцца яшчэ і дачка. Жанчына лічыць, што ўрачы зрабілі неверагоднае — паставілі сына на ногі. Трэба радавацца, але яна ўвесь час плача, бо колькі ёй прыйшлося перажыць за гэтыя некалькі месяцаў, калі ішла барацьба за жыццё яе сына, — словамі не перадаць. У яе сітуацыі гэта цяжэй удвая. Прызнаецца, што 23 красавіка, калі сына забралі ў апёкавы цэнтр у Мінск, стаў другім днём яго нараджэння. І тая дата цяпер у яе сэрцы.

— Я прадчувала бяду, не хацела адпускаць яго на тую рыбалку, бо возера далёка ад дому, — гэтыя ўспаміны ёй даюцца вельмі цяжка нават цяпер, калі страшнае ўжо мінула. — Але ён вельмі прасіўся, з ім ехаў старэйшы сябар. І я здалася. Калі мне паведамілі, што здарылася, падалося, зямля сыходзіць з-пад ног.

Вадзім дома, але сэрца маці працягвае балець. Кажа, што сын трымаецца малайцом, не скардзіцца, але яна бачыць, як ён сутуліцца пры хадзе, якая чырвоная і грубая скура на яго руцэ і назе. Хлопец пасля Мінскага апёкавага цэнтра некаторы час знаходзіўся ў Магілёўскай абласной бальніцы па рэабілітацыі. Пакуль яму далі невялічкую перадышку, каб ён крыху пабыў дома і набраўся сіл. Але наперадзе яшчэ працяг лячэння. Вадзім перанёс 19 аперацый, і не выключана, што будуць яшчэ.

Ходасы — невялічкі аграгарадок у Мсціслаўскім раёне, кожная навіна тут на слыху. І калегі, і жыхары заўсёды ў курсе падзей. Трагедыю Людмілы перажываюць, як сваю асабістую.

— Мы вельмі спачуваем Людміле, дапамагалі, хто чым мог, — прызналася Святлана Громава, начальнік Ходасаўскага паштовага аддзялення, дзе працуе Людміла. — Ведаем, што хлопчык ужо дома і нават сустракаецца з аднагодкамі. Мы вельмі перажываем за нашу Людмілу, бо ўсё здарылася, калі яна збіралася ў дэкрэт. Гэта быў шок.

Святлана кажа, што Вадзім — ветлівы і добры падлетак, чулы, разумны. Любая маці такім сынам можа ганарыцца. На тэрыторыі аграгарадка не было чалавека, арганізацый, прадпрыемстваў, якія не ўзялі б удзел у яго лёсе. За хлопца маліліся ў мясцовай царкве; нават вучні Ходасаўскай сярэдняй школы, дзе той вучыўся, падавалі запіскі.

СТАР. 4

КОРАТКА

- **З Канстытуцыі прапануецца прыбраць норму аб імкненні Беларусі да нейтралітэту.**
- Міністр абароны Віктар Хрэнін правядзе 14 жніўня прамую тэлефонную лінію з насельніцтвам.
- **У Беларусі за два месяцы знішчана больш за 70 тон нарказмяшчальных раслін.**
- У першай палове 2023 года беларускую вакцыну ад каранавіруса плануюць выпусціць у грамадзянскі абарот.
- **У Бабруйскім раёне ў полі згарэў трактар разам з прэс-падборшчыкам.**

# МЕДЫЦЫНСКАЯ, ТЭХНІЧНАЯ, ПЕДАГАГІЧНАЯ...

### За якую адукацыю гатовыя плаціць абітурыенты?

**11 жніўня прыёмная кампанія ў беларускіх ВНУ выйшла на фініш. У гэты дзень спісы «нававбранцаў» платнай формы навучання апублікавалі ўсе ВНУ.**
**Не сакрэт, што ў апошнія гады трапіць на платнае навучанне ў ВНУ можна нават з мінімальнай колькасцю балаў. Адзінае абмежаванне — гэта ніжні парог на ЦТ. Але ж ці можна лічыць сур'ёзным бар'ерам 10, 15 ці нават 25 балаў па профільных гуманітарных дысцыплінах? А для ВНУ сілавых ведамстваў, ваенных факультэтаў грамадзянскіх ВНУ і шэрагу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў устаноўлена яшчэ ніжэйшая планка, якая складае ўсяго 7 балаў...**

СТАР. 5

Прыёмная кампанія — 2021



ISSN 1990 — 763X

# «МЫ З КАРАНАВІРУСНАЙ БЯДОЙ СЁННЯ СПРАЎЛЯЕМСЯ НА ГОДНЫМ УЗРОЎНІ»

## Для людзей і для жывёл

«Белвітуніфарм» гатовыя перайсці ад стварэння лекаў для жывёлы да вытворчасці вакцыны для людзей. Пачаць мяркуюць са стварэння і разліву беларускай вакцыны ад каранавіруса. Эксперыментальны цэх для гэтага плануюць размясціць у асноўным корпусе. Пасля для вытворчасці вакцыны прадпрыемства пабудуе новы корпус, тэрыторыя ўжо падрыхтавана.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, якім чынам будзе арганізавана вытворчасць вакцыны ад каранавіруса, якія прадпрыемствы будуць задзейнічаны ў дадзенай рабоце і на якіх этапах. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што цяпер у свеце асаблівай папулярнасцю карыстаюцца расійская і кітайская вакцыны ад COVID-19. Ён падкрэсліў, што і беларуская павінна мець высокую эфектыўнасць.

На «Белвітуніфарме» размова ішла таксама аб штодзённай дзейнасці прадпрыемства па вытворчасці прэпаратаў для жывёлін. Было адзначана, што на рэгістрацыю новых вакцын сыходзіць два-тры гады, за гэты час на рынак паспявае трапіць замежны прэпарат. Таму на прадпрыемстве прапанавалі ўдасканаліць парадак рэгістрацыі айчынных прэпаратаў для жывёлін. «Падрыхтуйце ўсе рашэнні на працягу месяца, каб у верасні прынялі, — даручыў Прэзідэнт. — Да канца года закрываем гэтую тэму».

**Сяргей Бальшакоў, генеральны дырэктар «Белвітуніфарм»,** паведаміў, што працэс стварэння вакцыны для чалавека і для жывёлы па вытворчых пытаннях на 90 працэнтаў супадае. «Створана новае прадпрыемства сумесна з «Белмедпрэпаратамі», у якое будзе ўлівацца вопыт «Белмедпрэпаратаў», што працуе ў «чалавечай» медыцыне, і нашага, што працуе ў біялагічнай прамысловасці. Новае прадпрыемства будзе выпускаць вакцыну для людзей на новым абсталяванні без сувязі з жывёльным светам. Тут узаемасувязь адна — вопыт работы», — тлумачыць Сяргей Бальшакоў. Ён дадае, што практыка стварэння вакцыны для людзей на вытворчасці, якая спецыялізуецца на вырабе лекаў для жывёл — сусветная практыка. Так працуе, напрыклад, кампанія Pfizer.

Да пачатку візіту журналістам аб стане распрацоўкі беларускай вакцыны ад ковіду расказалі навукоўцы і вытворцы.

**Уладзімір Гарбуноў, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Міністэрства аховы здароўя,** паведаміў, што ўжо створаны прататып вакцыны і праводзяцца яго даклінічныя выпрабаванні. Спецыяліст дадае, што пакуль ствараюць выключна платформу для вакцыны. Яе будуць прыстасоўваць да штама віруса, які ў пэўны час цыркулюе ў грамадстве. Пасля даклінічных выпрабаванняў вакцына пройдзе фазу клінічных выпрабаванняў, будуць спраектаваны вытворчыя плошчы і прэпарат паставяць на вытворчасць.

**Сергей Бяляеў, генеральны дырэктар «Белмедпрэпаратаў»** — асноўнай будучай пляцоўкі па стварэнні беларускай вакцыны ад каранавіруса, акцэнтаваў увагу на тым, што вытворчасць будзе складацца з двух этапаў. Першы — дапрамысловая вытворчасць, калі лабараторную тэхналогію адаптуюць да прамысловай. На гэтым этапе плануюць задзейнічаць магутнасці «Белвітуніфарма», дзе будзе створаная актыўны кампанент. На «Белмедпрэпаратах» вакцыну мяркуюць «збіраць» і выпускаць ужо гатовыя дозы.

## Адна нявырашаная задача

Тэма барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй застаецца ў ліку прыярытэтных не толькі для нашай краіны, але і ўсяго свету, — з гэтага пачаў Прэзідэнт нараду па пытаннях распрацоўкі супрацьвірусных вакцын. Але адзначыў, што сёння няма глабальных падстаў для заклапочанасці. «У чарговы раз хачу запэўніць усіх: ***мы з каранавіруснай бядой сёння спраўляемся. Думаю, на годным узроўні, без лішняга інфармацыйнага шуму, палітычных сварак, дэманстрацый, камендантскіх гадзін, як у асобных краінах, асабліва з так званай развітой дэмакратыяй»***, — сказаў кіраўнік краіны.

Ён працягнуў, што не атрымалася ні ў кога пераламаць эканоміку і яе законы — лакдаўны, падзенне ВУП, беспрацоўе, вар'яцкія эмісійныя грошы, якія сёння ўкінутыя ў эканоміку планеты, узлёт сусветных цэн і іншыя наступствы працверазілі абсалютна ўсіх.

Па словах Прэзідэнта, Беларусь выдаткавала на барацьбу з ковідам толькі бюджэтных грошай 750-800 мільёнаў долараў. Плюс амаль столькі ж — самі арганізацыі ўсіх формаў уласнасці.

***«Наша небагатая краіна ўклала рэсурсы па ўсіх напрамках — надбаўкі ўрачам, закупка лекаў і вакцын, арганізацыя вытворчасці масак і сродкаў дэзынфекцыі. Мы бясплатна прышчапляем сваё насельніцтва і за невялікія грошы прымаем на прышчэпку ўсіх жадаючых замежнікаў. Па сутнасці, у нас засталася адна нявырашаная задача — атрыманне ўласнай вакцыны»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што для гэтага створана прававая база і падпісаны шэраг дакументаў.

Прэзідэнт расказаў, што ў няпросты час за кошт іншых галін знайшлі 10 мільёнаў рублёў інавацыйных грошай і бюджэтных сродкаў на карысць Міністэрства аховы здароўя і Акадэміі навук на першы этап вытворчасці вакцыны.

***«Засталося галоўнае — вынік у заяўленыя тэрміны!*** Тут прысутнічаюць тыя, хто ў свой час шпарка дакладваў тэму і пераконваў, што вакцыны мы атрымаем. І з Акадэміі вучоныя, і з Міністэрства аховы здароўя. Таму сёння патрэбныя не справаздачы аб вашым гераізме», — абазначыў кірунак размовы Прэзідэнт і заявіў, што яму хацелася б пачуць канкрэтныя захады і крокі, якія прынясуць эфект.

## Прымусовай вакцынацыі быць не павінна

На нарадзе абмеркавалі яшчэ некалькі пытанняў. Першае — прабягучыя тэмпы захваральнасці ў краіне, як лечаць хворых і якія вынікі.

«Я хачу адразу папярэдзіць: ніякай самазаспакоенасці быць не павінна. Гэта як і ў палітыцы. Пратэстуны, хвалі гэтыя схлынулі, але супакойвацца нельга. Вы бачыце, што нас цярэбяць з усіх бакоў, але Бог ёсць. Памятаеце, як прайшоўся па заходніх краінах засухай, ліўнямі і што ў нашых суседзяў адбываецца, больш за ўсё ў Літве, Латвіі і Польшчы? Пра Украіну не кажу...», — параўнаў медыцыну і палітыку Прэзідэнт.

Ад міністра аховы здароўя ён чакаў ацэнку дзейнасці кіраўнікоў рэгіёнаў і сталіцы па забеспячэнні лекамі, медыцынскім персаналам, бальнічнымі ложкамі, кіслародам, па рэабілітацыі і аднаўленні цяжкіх пацыентаў, захаванні выпрацаваных сацыяльных мерапрыемстваў.

Другая тэма нарады — вакцынацыя насельніцтва. Прэзідэнт нагадаў, што ў Беларусі зафіксаваны індыйскі штам каранавіруса і выпрацаваны прогнозы па яго лячэнні. Пакуль прагнозы апраўдваюць сябе, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Але колькі яшчэ будзе гэтых штамаў, і не толькі індыйскіх, ніхто не ведае. Таму я шмат разоў казаў і паўтараю: ***наша галоўная задача — у тым ліку і вакцынацыя. Кожны павінен разумець, што вакцына — гэта не адзін раз правакцынаваўся і ўжо ў бяспецы. Як паказвае сітуацыя ў свеце — не. Але тое, што вакцына паслабіць захворванне, калі заразішся, — гэта факт»***, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Ён адмовіўся ад пералічэння лічбаў узроўню неабходнай вакцынацыі па краіне і параіў зыходзіць з іншага прынцыпу.

***«Кожны чалавек — гаспадар свайго здароўя. Кожны чалавек павінен разумець, што гэта не толькі яго здароўе. Калі ён заразіўся, можа падкінуць заразу іншаму. У гэтым яго калектыўная, грамадская адказнасць»***, — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў, што прымусовай вакцынацыі быць не павінна.

«Катэгарычна папярэджваю, калі да мяне дойдзе інфармацыя, што кагосьці прымушаюць, схіляюць і гэтак далей, ведайце, што рэакцыя з майго боку будзе імгненная і катэгарычная. ***Добраахвотная вакцынацыя: хоча чалавек, хай вакцынуецца, не хоча — не трэба»***, — растлумачыў сваю пазіцыю кіраўнік краіны.

На яго думку, таму што ў Беларусі не прымушаюць, як у Літве, прышчапляцца, дзве дозы ўжо атрымала больш за мільён чалавек, адзін укол зрабіла каля двух мільёнаў беларусаў.

«Цяжка сказаць, многа гэтага ці мала. Пакуль я не магу ні з чым параўнаць. Ды і міжнародныя даследаванні, разнастайныя заявы, артыкулы ў журналах не даюць мне падстаў заявіць, многа ці мала. Вакцына ёсць. Ёсць кітайская, расійская, Захад прапанаваў нам праз Рэспубліку Польшча заходнюю вакцыну. Калі Мінахова здароўя яна неабходная, мы можам яе завезці, каб людзі маглі выбраць», — прапанаваў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт папрасіў далажыць, як прасоўваецца працэс вакцынацыі насельніцтва ў рэгіёнах і калі дасягнем жаданага ўзроўню.

Трэці блок пытанняў — вытворчасць вакцын, і не толькі ад ковіду.

«Мы засноўваем вытворчасць усіх вакцын. Сёння гэта ковід, а заўтра нейкая іншая будзе зараза. Але ў нас павінна быць вытворчасць гатовая, як у Расіі. У іх вытворчасць ёсць, яны выдзелілі вірус, нешта «пабадзяжылі» і пачалі вытворчасць. У нас павінна быць аналагічна»,— мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

На парадку дня нарады было і пытанне вытворчасці некаторых вакцын для жывёл, у тым ліку і ад афрыканскай чумы свіней.

«Мы дамаўляліся, што мы будзем працаваць у гэтым кірунку. Як мяне праінфармавалі, вакцына ёсць. Таксама абмяркуем гэтае пытанне», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля нарады яе вынікі для журналістаў падвёў міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч, які сказаў, што размяшчэнне доследна-прамысловага ўчастка па вытворчасці айчыннай вакцыны на базе «Белвітуніфарм» быў адобраны.

«Вызначылі тэрміны. Будзем рыхтаваць дакументы», — адзначыў міністр. Па яго словах, у грамадзянскі абарот беларуская вакцына выйдзе ў першым паўгоддзі 2023 года.

**Марыя ДАДАЛКА, Віцебскі раён.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Мадагаскара адправіў у адстаўку ўрад



Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на заяву канцылярыі прэзідэнта. Андрэ Радзуэліна адправіў у адстаўку ўсіх членаў урада. Прычыны такога кроку з боку кіраўніка дзяржавы ў заяве канцылярыі не прыводзяцца. Між тым, у сваім выступленні ў мінулую нядзелю па нацыянальным тэлебачанні Андрэ Радзуэліна раскрытыкаваў дзейнні ўрада і шэрагу міністраў, назваўшы іх нездавальняючымі. «Як і ў футбольнай камандзе, людзі павінны мяняцца, калі ў рабоце ўрада ёсць праблемы», — адзначыў прэзідэнт.

Цяперашняе рашэнне прынята на фоне расследавання справы аб замаху на кіраўніка дзяржавы. З 20 ліпеня ўлады арыштавалі 21 чалавека, у тым ліку 12 ваеннаслужачых.

### Крыптабіржа Coinbase павялічыла чысты прыбытак у 50 разоў



Coinbase Global Inc., аператар найбуйнейшай у ЗША крыптавалютнай біржы, павялічыў чысты прыбытак у другім квартале ў 50 разоў — да $1,6 млрд супраць $32 млн годам раней. Гэта першая квартальная справаздачнасць, якую Coinbase прадставіла як публічная кампанія. Падчас красавіцкага прамога лістынгу на Nasdaq крыптавалютная біржа атрымала ацэнку ў $85,5 млрд. Колькасць аўтарызаваных карыстальнікаў Coinbase на канец другога квартала складала 68 мільёнаў у параўнанні з 56 млн на канец першага квартала. «Крыптаэканоміка ўсё яшчэ знаходзіцца ў перыядзе станаўлення, — адзначаецца ў прэс-рэлізе Coinbase. — Валатыльнасць цэн на крыптавалюты добра карэлюецца з дынамікай нашай выручкі ад гандлёвых аперацый».

### У краіны Міжземнамор'я прыйшла наймацнейшая спёка



Краіны Міжземнамор'я сутыкнуліся з анамальна гарачым надвор'ем, у некаторых рэгіёнах установлены тэмпературныя рэкорды.

Гарачыня ўстанавілася, у прыватнасці, у Францыі, Іспаніі, Італіі. На Сіцыліі напярэдадні тэмпература паветра паднялася да 48,8 градуса, адзначае La Repubblica. Гэта найвышэйшая тэмпература, якая калі-небудзь была зарэгістравана ў Еўропе. Папярэдні тэмпературны рэкорд у 48 градусаў быў устаноўлены ў 1977 годзе ў Афінах. Гарачае надвор'е прывяло да распаўсюджвання лясных пажараў у шэрагу рэгіёнаў Італіі, Грэцыі і Турцыі. У краінах Афрыкі таксама фіксуюць анамальныя тэмпературы. У Тунісе тэмпература паветра паднялася да 50,3 градуса. У Алжыры было 47 градусаў. На поўначы краіны бушуюць лясныя пажары, з-за якіх загінула больш чым 60 чалавек. У Марока прагназуюць, што тэмпература паветра ў выхадныя дасягне 49 градусаў.

З нагоды

# МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ ДЗЯРЖАВЫ

**Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі стаў Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ. Яго абралі на пленуме ЦК, які прайшоў учора ў Мінску пасля чарговага з'езда БРСМ. Мерапрыемства прайшло пад слоганам «Адзінства моладзі — сіла Беларусі!»**

Раней Аляксандр Лук'янаў займаў пасаду начальніка аддзела даследаванняў у галіне ліквідацыі надзвычайных сітуацый Навукова-даследчага інстытута пажарнай бяспекі і праблем надзвычайных сітуацый МНС.

З'езд БРСМ прайшоў у фармаце адкрытага дыялогу і аб'яднаў 500 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, прадстаўнікоў розных катэгорый актыўнай моладзі: навучэнцаў, студэнтаў, сельскай моладзі, тых, хто праходзіць службу ў сілавых структурах. Падчас з'езда былі абмеркаваны вынікі работы маладзёжнай арганізацыі за мінулыя тры гады, прынята Стратэгія развіцця БРСМ да 2025 года, таксама адбылося абранне новага складу Цэнтральнага камітэта і Цэнтральнай кантрольнай камісіі БРСМ. Асноўныя мерапрыемствы з'езда завяршылі пленумы ЦК і ЦКК з выбарамі іх кіраўнікоў.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА,** выступаючы на з'ездзе, адзначыў, што маладзёжная палітыка — адзін з прыярытэтаў у рабоце дзяржаўных інстытутаў Беларусі.

— У краіне робіцца ўсё, каб кожны мог рэалізаваць сябе ў жыцці, прафесіі, грамадскай рабоце, сям'і — як грамадзянін і як патрыёт. У падтрымку таленавітай моладзі, шматдзетных сем'яў, стварэнне сістэмы працаўладкавання маладых спецыялістаў укладваюцца вялікія рэсурсы, так будзе і ў далейшым. Кіраўнік дзяржавы аддае самую пільную ўвагу развіццю маладзёжных ініцыятыў і праектаў. Распрацаваны і рэалізоўваюцца прававыя акты, накіраваныя на падтрымку студэнцкага студатрадаўскага руху, сельскай моладзі, таленавітых і адораных хлопцаў і дзяўчат, стварэнне рэзерву кадраў для рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады і кіравання, развіццё многіх іншых ініцыятыў і кірункаў. Сёлета па даручэнні Прэзідэнта дзяржорганамі сумесна з БРСМ распрацавана Стратэгія развіцця БРСМ да 2025 года, якая ў тым ліку абмяркоўвалася дэлегатамі з'езда. Гэта сведчыць пра тое, што БРСМ займае годнае месца і з'яўляецца галоўным памочнікам дзяржавы ў распрацоўцы і рэалізацыі маладзёжнай палітыкі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

## Моладзь ведае і памятае



Напярэдадні з'езда Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі ў сталіцы прайшла ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да п'едэстала манумента Перамогі і Вечнага агню. У ёй узялі ўдзел прадстаўнікі маладзёжных дэлегацый з Мінска і Мінскай вобласці, галіновых камітэтаў БРСМ. Гэтае традыцыйнае мерапрыемства даказвае: моладзь Беларусі ведае, памятае і шануе гісторыю гераізму нашых продкаў.

**Аліна МАЗАВЕЦ, фота аўтара.**



Блізкая ўлада

## ЗВАНКІ ПРЫМАЮЦЦА ПА НУМАРЫ...

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 14 жніўня, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44

Меркаванні і ўражанні

# «ВЫ ЖЫВЯЦЕ Ў ЦУДОЎНАЙ КРАІНЕ З ВЯЛІКАЙ БУДУЧЫНЯЙ»

### Так лічыць журналіст з Грузіі, які меў магчымасць першы задаць пытанне кіраўніку дзяржавы

**Валерый КВАРАЦХЕЛІЯ застаўся пад уражаннем ад «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», якая днямі адбылася ў Мінску. Увогуле, доктар філасофіі, пісьменнік, кіраўнік Цэнтра грузінска-расійскага сяброўства, прэзідэнт Грамадскай акадэміі нацыянальных і сацыяльных адносін у захапленні ад нашай краіны. Гэтым медыйны эксперт падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» падчас інтэрв'ю.**

***— Валерый Давідавіч, ці не стаміліся падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», якая доўжылася рэкордныя 8 гадзін і 15 хвілін?***

— Захапляюся вашым кіраўніком дзяржавы, які столькі часу змог вытрымліваць такі напльў пытанняў, у тым ліку не самых прыемных і добразычлівых. У мяне свае ўяўленні аб Прэзідэнце Лукашэнку, Беларусі, вашым укладзе жыцця. І яны пацвердзіліся, калі я ўсё ўбачыў на свае вочы. Як яго сустракалі, як праводзілі — гэта ж трэба заслужыць!

***— Вас даўно не было ў нашай краіне. Што памяняласся ў Беларусі з таго часу, калі вы былі тут апошні раз?***

— Я не быў у Мінску з 2010 года. І хачу сказаць, што за гэты час не змянілася нічога: у вас, як і раней, прыгожа, утульна, спакойна. Калі нешта і памянялася, дык толькі да лепшага. Нават з ілюмінатара самалёта відаць, якая ў вас цудоўная краіна. Беларускія самазвалы, трактары, халадзільнікі ведаюць ва ўсім свеце. Я днямі зайшоў у адну з мінскіх крам, дзе мне вельмі спадабаўся касцюм. Падумаў, што, хутчэй за ўсё, ён пашыты ў Францыі ці Італіі. Аказалася, што ён беларускі. І цана даступная. Як і мінулым разам, цяпер у Беларусь я прыехаў са сваім сынам. І мы шмат хадзім, глядзім. Я дзеля інтарэсу наваат прапанаваў сыну знайсці ў Мінску хоць адзін недакурак. Нідзе няма! З прыгожых праспектаў і вуліц зайшлі ў двары: часта фасад прыгожы, а за ім — зусім іншы бок медаля. І там здзівіліся: усё чыста, культурна. Нават у двары не ўбачылі ні аднаго недакурка. Трапілі на яго самым вечарам. Адзін за некалькі дзён, прычым жа наўмысна шукалі!




***— Акрамя таго, гуляючы па мінскіх вуліцах, вы яшчэ паспелі правесці сацыялагічнае даследаванне. Пра што вы размаўлялі з беларусамі?***

— Я ставіў перад сабой мэту вывучыць грамадскае меркаванне. Як толькі мы выйшлі з будынка аэрапорта і селі ў таксі, ужо ў кіроўцы аўтамабіля я пачаў пытацца пра тое, ці задаволены ён тым, што адбываецца ў Беларусі. Ніякага негатыву! Наадварот, людзі падтрымліваюць вашага Прэзідэнта. Кажуць, што тыя, хто бегаў за Ціханоўскай, нічога не даб'юцца, бо народ разумее, дзеля чаго гэта ўсё. Я і дагэтуль лічый той шлях, па якім ідзе цяпер Беларусь, правільным. І мне прыемна, што маё меркаванне супала з думкамі саміх беларусаў. Размаўляў з людзьмі на вуліцы, у крамах, у гасцініцы, дзе спыніўся, і ні адзін чалавек мне не выказаў сваё незадавальненне ўладай і тым, што адбываецца ў Беларусі.

***— Вам ёсць з чым параўноўваць...***

— Я прыехаў у Беларусь з той краіны, у якой абсалютна ўсё па-іншаму. Народ не хацеў развалу Савецкага Саюза. 30 гадоў прайшло з тых падзей. Што мы маем сёння ў Грузіі? Нам казалі, што мы станем незалежнай дзяржавай. Мы ж сёння больш залежныя ад Злучаных Штатаў Амерыкі, ад калетыўнага Захаду, чым тады былі залежныя ад СССР. Нам абяцалі, што эканоміка будзе квітнець. Яна ж увогуле развалілася. Пры Савецкім Саюзе ў Грузіі працавалі такія прамысловыя гіганты, як заводы авія-, судна-, станка-, машынабудавання, добра развіваліся металургія, хімічная вытворчасць, якія гарантавалі годнае жыццё кожнаму жыхару рэспублікі. Пасля развалу СССР гэтыя заводы разбурылі і прадалі за мяжу як металалом. Некалькі чалавек разбагацела пасля гэтай прыватызацыі, якую народ назваў «прыхватызацыяй». А людзі засталіся ні з чым. Пасля таго ў Грузіі адбыліся грамадзянская вайна, войны з Абхазіяй, Паўднёвай Асеціяй. Пазакрываліся некаторыя навучальныя ўстановы, сталі платныя медыцына, навучанне, якое яшчэ і знізілася па якасці. Жыццё пагоршылася — і народ пачаў бегчы як мага далей ад сваёй Радзімы ў пошуку кавалка хлеба. Калі насельніцтва Грузіі пры Саюзе дасягала 6,5 мільёна чалавек, то сёння нас каля 3 мільёнаў. Мы страцілі палову свайго насельніцтва, 22 % тэрыторый. І гэта ўсё называюць дэмакратыяй і свабодай! Нам абяцалі, што мы далучымся да НАТА, уступім у Еўрасаюз. Прайшло 30 гадоў — нас нікуды так і не прынялі. А краіна працягвае развальвацца. Вы самі бачыце, што адбываецца ва Украіне. А гэта адна з самых вялікіх еўрапейскіх дзяржаў! І таксама ва ўсім вінаватая празаходняя арыентацыя.

У Беларусі нічога падобнага не адбылося. Ваш кіраўнік як у ваду глядзеў і добра разумеў, чым могуць скончыцца так званыя мірныя пратэсты, таму не даў разваліць краіну. Аляксандр Рыгоравіч абараняў не сябе, а народ. Гераічны народ, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны страціў кожнага трэцяга свайго жыхара. І ніхто ён можа здрадзіць гэтым людзям, якія з'яўляюцца нашчадкамі пераможцаў?! Эканоміка працуе, прэса функцыянуе, народ задаволены. Што яшчэ трэба зрабіць, каб Захад прызнаў вашу дэмакратыю? Абавязкова такі сцэнарый, як у Грузіі ці ва Украіне? Абавязкова трэба страціць чвэрць сваіх тэрыторый, давесці насельніцтва да паловы? Вы на правільным шляху. Зрабіць больш, чым зрабіў Лукашэнка, было немагчыма. Падчас візіту ў вашу краіну я пераканаўся, што вы жывяце ў цудоўнай краіне з вялікай будучыняй.

**Вераніка КАНЮТА.**

Алімпійскі дзённік

# «ЗРАБІЦЕ ТОЕ, ШТО ЎМЕЕЦЕ, А ЎМЕЕЦЕ ВЫ МНОГАЕ»

## Беларускіх параалімпійцаў праводзілі на Гульні ў Токіа

**Алімпійскія гульні ў Токіа скончыліся, але спартыўны азарт у японскай сталіцы працягвае кіпець. Пачынаюцца XVI Летнія Параалімпійскія гульні. Беларусь на гэтым форуме прадставяць 20 спартсменаў. Выступяць яны у пяці відах спорту: плаванні, лёгкай атлетыцы, фехтаванні, дзюдо і веславанні.**


Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

Параалімпійскую каманду на Гульні ў Токіа праводзілі 12 жніўня ў Мінску каля стэлы «Мінск — горад-герой», знакавага месца беларускай сталіцы. «Прыемна бачыць вас у такім баявым настроі! Гэта пяцігадовая праца цэлага калектыву, трэнерскага штаба, навукі, тэхнічнай групы паступова пераходзіць да завяршэння. Упэўнены, што яна не пройдзе дарма. Вынікі гэтага сезона кажуць пра тое, што мы ў добрай фізічнай форме і ведаем, як змагацца з наймацнейшымі атлетамі на міжнароднай арэне. Упэўнены, што ўсё ў вас атрымаецца. Зрабіце тое, што ўмееце, а ўмееце вы многае», — павітаў спартсменаў **першы намеснік міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Вячаслаў ДУРНОЎ.**

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ** падкрэсліла, што для таго каб трапіць на Параалімпійскія гульні, спартсмены выканалі найскладанейшую работу. «У вас усё атрымалася. Вы героі! Я шчыра вам жадаю верыць у сябе, і ў вас усё атрымаецца. За вамі краіна і з вамі краіна. Кожны беларус верыць, што вы пераможаце. Вы беларусы, вы моцныя і вы зможаце ўсё!», — сказала міністр.

Па словах **старшыні Нацыянальнага параалімпійскага камітэта Алега ШЭПЕЛЯ,** поспехі спартсменаў-параалімпійцаў будуць прыкладам для ўсіх людзей з абмежаванымі магчымасцямі: «Краіна ўклала многае ў вашу падрыхтоўку. І вы павінны паказаць, што вы людзі з вялікай літары. Я ўпэўнены, што ў вас усё атрымаецца. І калі вы сваім прыкладам выцегняце з чатырох сцен хоць бы некалькіх калясачнікаў — гэта вялікі поспех. Я ў вас веру! Я вамі ганаруся!»

Ад імя Нацыянальнага алімпійскага камітэта параалімпійскую зборную прывітала **генеральны сакратар НАК Беларусі Паліна ГАЛАВІНА.** «Мне здаецца, што кожны, хто сёння вытрымаў адбор, — ужо герой і пераможца, таму што змог прадэманстраваць каласальную волю да перамогі, упартасць, цярпенне і вялікую мужнасць. Мы верым, што вы зможаце паказаць тое, на што вы здольныя. Мы верым, што вы станеце яркім прыкладам мужнасці і спартыўных перамог», — адзначыла яна.

Капітанам беларускай каманды ў Токіа будзе **Ганна Канюк,** адна з самых тытулаваных лёгкаатлетак у беларускай параалімпійскай зборнай. У яе спартыўнай гісторыі чатыры Параалімпіяды. У Афінах-2004 і ў Лондане-2012 яна станавілася бронзавым прызёрам у скачках у даўжыню сярод слабавідушчых спартсменак. **Капітан беларускай алімпійскай каманды Іван ЦІХАН** перадаў Ганне беларускі сцяг, які ўжо пабываў на алімпійскім стадыёне ў Токіа. «Яны дакладна ведаюць, што едуць па сваю мэту і каб увасобіць мару ў рэальнасць. Размаўляючы са спартсменамі, я ўбачыў у іх жаданне змагацца і кампенсаваць наша выступленне. Пажаданне простае — зрабіць тое, што яны могуць, на што гатовыя. І калі яны гэта выканаюць, то ў іх будуць і медалі, і ўнутраная задаволенасць сабой», — падкрэсліў Іван Ціхан. Па яго словах, самае складанае ў Токіа — не шматлікія каранавірусныя абмежаванні, а перамога над уласнымі страхамі і хваляваннем.

А сама Ганна Канюк настроена па-баявому. «Мы сур'ёзна трэніраваліся, рыхтаваліся. І кожны з нас хоча паказаць высокі вынік, выступіць годна і заваяваць медаль. Мы цяжкасцяў не баімся, яны робяць нас мацнейшымі, і мы настроены на тое, каб усё лёгка перанесці і выступіць добра. Я ўжо другі раз капітан каманды і вялікі гонар, што каманда абрала мяне», — падзялілася яна.

**Параалімпійскія гульні ў Токіа адбудуцца з 24 жніўня да 5 верасня. Усяго будзе разыграна 539 камплектаў медалёў у 22 відах спорту. Плануецца, што ў Гульнях возьме ўдзел каля 4400 спартсменаў.**

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «НА ВЫРАТАВАННЕ БЫЛІ НАКІРАВАНЫЯ КАЛАСАЛЬНЫЯ РЭСУРСЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Былая настаўніца, а сёння пенсіянерка Наталля Бліннікава і яе старэйшая калега Любоў Лехава арганізавалі збор грошай, каб дапамагчы сям'і.

— Ніводны не адмовіўся далучыцца да добрай справы, — кажа Наталля Дзмітрыеўна. — Усе спачувалі.

Калі б не тая трагедыя, Вадзім, напэўна, ужо сёлета б стаў курсантам Магілёўскага інстытута МУС.

— У Мсціслаўскім РАУС ёсць заява на яго паступленне да нас, — адзначыла афіцыйны прадстаўнік ВНУ Марына Грамыка. — У нас прыём заявак быў да 25 красавіка, але ён падаў дакументы загадзя.

Цяпер галоўная задача Вадзіма — набірацца сіл і змагацца далей. Пакуль — ніякіх прагнозаў. Усе, з кім атрымалася паразмаўляць, жадалі яму хутчэй стаць на ногі і, як той казаў, вярнуцца ў строй. Маці Вадзіма, Людміла Рыбчынская, папрасіла ад яе імя і ад імя ўсёй



сям'і падзякаваць усім за клопат і ўвагу да сына. Яна ўдзячная Прэзідэнту, які ўзяў пад асабісты кантроль лячэнне Вадзіма, урачам, якія выцягнулі яго, лічы, з таго свету, землякам, усім тым жыхарам Беларусі, якія сачылі за ходам лячэння, маліліся за падлетка і падтрымлівалі сям'ю.

Як паведамляюць афіцыйныя сродкі інфармацыі, медыкаў, што выратавалі Рамана і Вадзіма, прадставяць да дзяржаўных узнагарод. Маці Вадзіма ні на секунду не сумняваецца, што людзі ў белых халатах здзейснілі сапраўдны подзвіг.

**Ігар КАСКО, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы, сенатар ад Магілёўскай вобласці:**

— Асноўны блок тэрапіі хлопчык атрымаў у Мінску ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, дзе яму зроблена 19 хірургічных карыруючых умяшанняў, дзе толькі паўтара месяца праводзілася інтэнсіўная тэрапія. У нас ён быў кароткі прамежкавы перыяд перад выпіскай дамоў — 2-2,5 тыдня. Яго чакае яшчэ вялікі блок рэабілітацыйна-аднаўленчых мерапрыемстваў і хірургічнай карэкцыі, якая будзе выконвацца ў Мінску. Мы ў гэтай гісторыі моцна не задзейнічаныя, але ў якасці каментарыя магу сказаць адно: на выратаванне гэтага дзіцяці былі накіраваныя каласальныя рэсурсы. Вызывальнасць людзей, якія атрымліваюць такія вялікія апёкі цела, вельмі нізкая. Такая медыцынская дапамога магла быць аказана толькі ў высокатэхналагічнай развітой краіне, у якой хапае рэсурсаў для выратавання дзіцяці ў такой сітуацыі. Мне вельмі горка чуць, калі нехта заклікае да ўвядзення санкцый супраць Беларусі. Да чаго мы заклікаем? Да таго, каб мы не маглі аказваць дапамогу дзецям? Не давалі ім надзею на жыццё? Тое, што зрабілі мінчане па аднаўленні гэтага хлопчыка, — неверагодна. Я знімаю шапку і кланяюся гэтым дактарам у ногі. Мы пастараемся працягнуць тое, што яны пачалі, і максімальна аднавіць гэтае дзіця.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Людмілы Рыбчынскай: Вадзім, папраўляйся!**

Надвор'е

# Дажджы, навальніцы, слабы туман...

## Але месцамі ці ў асобных раёнах

**Сёння ўмовы надвор'я ў Беларусі будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, толькі ноччу па поўначы краіны адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы. Пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі ноччу месцамі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы.**



У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Вецер заходні, паўночна-заходні слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы плюс 9—15, днём — плюс 21—27. Атмасферны ціск будзе слаба расці.

14 жніўня ноччу захаваецца ўплыў зоны павышанага атмасфернага ціску, днём з тэрыторыі Польшчы чакаецца перамяшчэнне франтальнага раздзела. Пераменная воблачнасць. Ноччу пераважна без ападкаў, днём месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Вецер паўднёва-заходні, паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы 8—5 вышэй за нуль, днём ад плюс 23 па поўначы да 30 па поўдні краіны.

15 жніўня ноччу захаваецца ўплыў атмасфернага фронту, днём надвор'е будзе фарміраваць няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Заходняй Еўропы. Воблачна з праясненнямі. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах краіны прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты. Тэмпература паветра ноччу плюс 11—18, днём ад 20 градусаў па паўночным захадзе да 31 па паўднёвым усходзе краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Фэст

# КАСІЦЬ, КАБ ДУША РАДАВАЛАСЯ

## У вёсцы Высокае Бярозаўскага раёна 14 жніўня пройдзе экалагічны фестываль «Спораўскія сенакосы»

**У спаборніцтве па кашэнні балота возьмуць удзел 22 каманды касцоў. Гэтым разам жанчыны нароўні з мужчынамі павінны будуць хутка і чыста пракасіць паласу шырынёй у тры метры і даўжынёй у 100 метраў. Пры гэтым скасіць трэба не вышэй за 77 міліметраў, суддзі будуць скрупулёзна правяраць пакос. Потым, па выніках каманднага першынства, найлепшыя касцы паспаборнічаюць на 100-метровай дыстанцыі з шырынёй пакосу 1,5 метра.**

Гледачы таксама чакаюць ужо традыцыйны футбол на балоце. Сёлета спаборніцтва пройдзе ў сёмы раз. Заяўкі на ўдзел падалі 10 камандаў. А ў гэтым годзе адбудзецца яшчэ і турнір па гульні ў гарадкі. Для дзяцей будзе разгорнута дзіцячая пляцоўка. Як заўсёды, будзе даступны выязны продаж. Касцюмы для выступленняў рыхтуюць творчыя калектывы. Арганізатары анансавалі ўдзел у культурнай праграме казацкага ансамбля «Бацька Атаман». Наведвальнікам прапануюць шмат цікавостак і забаўлянак.

Ну а галоўныя героі фэсту — касцы — менцыць косы ў чаканні падзеі года. Як сказаў аўтару гэтых радкоў на адным з першых фестываляў вельмі сталы мясцовы жыхар: «Калі косіш і душа радуецца — тады гэта сапраўдная касьба». Тыя словы не забываюцца і могуць стаць найлепшым наказам удзельнікам спаборніцтваў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# МЕДЫЦЫНСКАЯ, ТЭХНІЧНАЯ, ПЕДАГАГІЧНАЯ...

## ПРАГРАМІСТ ЦІ РАДЫЁЭЛЕКТРОНІК?

Між іншым, сёлета вышэйшыя навучальныя ўстановы сутыкнуліся з дэфіцытам абітурыентаў нават пры залічэнні на бюджэт. Незапоўненыя засталіся месцы на тэхнічных, сельскагаспадарчых, ваенных спецыяльнасцях... Вельмі неахвотна абітурыенты ішлі на спецыяльнасці, дзе рыхтуюць настаўнікаў фізікі і інфарматыкі. Нават у Беларускім дзяржаўным універсітэце давялося абвяшчаць дадатковы набор на бюджэтныя месцы на механіка-матэматычны, фізічны факультэты і ў Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут БДУ імя А. Сахарава. Дакладныя навукі заўсёды былі слабым месцам у выпускнікоў. А той, хто імі добра валодае, як правіла, выбірае спецыяльнасці, якія могуць адкрыць дарогу ў IT.

Але і ў БДУІР — галоўнай кузні «айцішнікаў» — сёлета былі праблемы з наборам. Традыцыйна самы запатрабаваны ў абітурыентаў — факультэт камп'ютарных сістэм і сетак. А самай папулярнай сярод абітурыентаў на дзённай бюджэтнай форме навучання стала спецыяльнасць «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». На першым месцы ў сваёй заяве яе ўказалі 332 чалавекі (пры плане прыёму — 60).

Варта нагадаць, што абітурыенты БДУІР маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты. У спісе, з якога яны выбіраюць, — 34 спецыяльнасці. Калі абітурыент не праходзіць па сваіх балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей. Прычым пры падачы дакументаў можна падаць адразу дзве заявы: на бюджэтную і платную формы навучання. Пры гэтым пералік спецыяльнасцяў, іх колькасць і прыярытэты могуць быць розныя для дзвюх заяў.

Пасля закрыцця 9 жніўня прыёмных камісій стала вядома, што ў БДУІР на 1042 месцы на платнай форме навучання пададзены 1163 заявы. Прыярытэты ў абітурыентаў засталіся тыя ж: па «праграмным забеспячэнні інфармацыйных тэхналогій» было 216 ахвотных на 60 месцаў.

На спецыяльнасці «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў гульнявой індустрыі» на 105 месцаў прэтэндавалі 160 чалавек. А на «інфармацыйных сістэмах і тэхналогіях у эканоміцы» — 41 ахвотны на 30 месцаў. Наогул, колькасць прэтэндэнтаў перавышала колькасць месцаў мала на якіх спецыяльнасцях, а на большасці адчуваўся відавочны дэфіцыт ахвотных навучацца. І дакументы абітурыенты падавалі з даволі сціплымі баламі. Дзякуючы аўтаматызаванай сістэме і магчымасці быць залічанымі на другі, трэці і гэтак далей прыярытэт, згаданы ў заяве, платныя месцы ўсё ж такі запоўніліся, але наўрад ці гэта быў мэтанакіраваны і свядомы выбар прафесіі прэтэндэнтаў на студэнцкі білет.



У Беларускім дзяржаўным універсітэце сярэдні конкурс на дзённую платную форму навучання склаў 1,25 чалавека на месца. На першы курс залічаны 1699 абітурыентаў. Сярод залічаных 145 чалавек скончылі з адзнакай сярэднюю школу або сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, што складае 8,6 працэнта ад агульнай колькасці залічаных. 38 працэнтаў ад агульнай колькасці абітурыентаў, залічаных па выніках трох ЦТ, маюць больш за 300 балаў. Самыя высокія прахадныя балы склаліся на спецыяльнасцях «міжнароднае права» (332); «міжнародныя адносіны» (332), «лінгвакраіназнаўства» (329); «інфармацыя і камунікацыя» (320), «правазнаўства» (301); «хімія лекавых злучэнняў» (296), «бізнес-адміністраванне» (296), «фундаментальная хімія» (294); «эканамічнае права» (293).

## З ЛЮБЫМІ БАЛАМІ

У БНТУ сёлета назіраліся сур'ёзныя праблемы нават з запаўненнем бюджэтных месцаў. Дадатковы набор быў абвешчаны на 18 спецыяльнасцяў. Натуральна, што і платныя месцы не змаглі запоўніцца.

На спецыяльнасцях, дзе конкурсу не было, прахадныя балы былі даволі нізкія: «аўтасэрвіс» —159, «тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў» — 137, «масты, транспартныя тунэлі і метрапалітэны» — 135.

На спецыяльнасць «аўтамабільныя дарогі» конкурс склаў адзін чалавек на месца (прахадны бал — 134), «эканоміка і арганізацыя вытворчасці (прыборабудаванне)» — адзін чалавек на месца (прахадны бал — 127 ), «прамысловы дызайн транспартных сродкаў» — адзін чалавек на месца (прахадны бал — 122).

На спецыяльнасцях, дзе было больш за аднаго прэтэндэнта на месца, самыя высокія прахадныя балы назіраліся на «архітэктурным дызайне» — 291 бал, «праграмным забеспячэнні інфармацыйных тэхналогій» — 265, «мытнай справе» — 257, «архітэктуры» — 252. Самы высокі конкурс на платнай форме навучання быў на «архітэктурным дызайне» — 1,6. Трэба заўважыць, што ў параўнанні з бюджэтнай формай навучання, на платнай прахадныя балы былі нашмат меншыя: розніца склала 60, 80 балаў і больш. Так, на спецыяльнасці «эканоміка і арганізацыя вытворчасці (прыборабудаванне)» машынабудаўнічага факультэта на бюджэтнай форме прахадны бал быў 286, а на платнай — 127.

## «РУЛЯЦЬ» СТАМАТОЛАГІ І ФАРМАЦЭЎТЫ

Што датычыцца вышэйшай медыцынскай адукацыі, то абсалютна без праблем запоўніліся ўсе платныя месцы ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.

— Конкурс сярод абітурыентаў, якія выказалі жаданне платна вучыцца на ўрача і правізара ў вядучым медыцынскім універсітэце краіны, у гэтым годзе адбыўся. Адпаведна, план прыёму выкананы цалкам, — падкрэсліў **адказны сакратар прыёмнай камісіі Белдзяржуніверсітэта Аляксей КАДУШКІН**. — Калі казаць аб прахадных балах, то на многіх факультэтах яны павысіліся. Напрыклад, каб стаць студэнтам-платнікам першага курса лячэбнага факультэта, у бягучым годзе неабходна было набраць 323 балы (у 2020-м — 293 балы). Права вучыцца на стаматалагічным факультэце атрымалі абітурыенты, якія мелі ў сваім «багажы» 343 балы (у 2020-м — 334), на фармацэўтычным факультэце (дзённае аддзяленне) — 340 балаў (летась — 314 балаў). Прахадны бал на педыятрычным факультэце — 309 (паўпрахадны — 308), медыка-прафілактычным — 256, фармацэўтычным — 286 (завочная форма платнага навучання).

Пры гэтым максімальныя балы ў першакурснікаў-платнікаў наступныя: на лячэбным факультэце — 359, на педыятрычным — 337, медыка-прафілактычным — 328, стаматалагічным — 386, фармацэўтычным — 360 на дзённай і 334 — на завочнай форме.

Педагагічная адукацыя карыстаецца ў моладзі меншым попытам. Ва ўсякім разе, абітурыенты з высокімі баламі педагагічныя спецыяльнасці выбіраюць рэдка. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на платнай форме навучання запатрабаваныя ў абітурыентаў сёлета былі такія спецыяльнасці, як «лагапедыя», «сурдапедагогіка», «практычная псіхалогія», «псіхалогія», «сацыяльная і псіхолага-педагагічная дапамога», «аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура». Але «матэматыка з інфарматыкай» і «фізіка з інфарматыкай» маладых людзей зноў не зацікавілі.

## АБІТУРЫЕНТАЎ НЕ ХАПАЕ

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы студэнтамі платнай формы навучання сталі 1082 чалавекі. Асаблівай папулярнасцю ў абітурыентаў карысталіся група спецыяльнасцяў «дызайн (віртуальнага асяроддзя)»; «дызайн (касцюма і тканін)»; «дызайн (графічны)», спецыяльнасць «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка» і «рамана-германская філалогія (нямецкая)» на дзённай форме навучання, а таксама спецыяльнасці «выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка», «пачатковая адукацыя», «фізічная культура» (на завочнай форме са скарочаным тэрмінам навучання).

Самыя высокія прахадныя балы на дзённай форме навучання сфарміраваліся на спецыяльнасці «рамана-германская філалогія (нямецкая)» (277) і «мытная справа» (270), а на завочнай форме са скарочаным тэрмінам навучання — на «выяўленчым мастацтве і камп'ютарнай графіцы» (243) і «пачатковай адукацыі» (209).

У Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на платную форму навучання планавалі набраць 75 чалавек, з іх на спецыяльнасць «дзяржаўнае кіраванне і права» — 35, «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 20 і «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 20. У конкурсе на платныя месцы ўзяў удзел 81 чалавек.

Нават беглы аналіз запаўнення пазабюджэтных месцаў у ВНУ падштурхоўвае да высновы, што стаць студэнтам платнай формы навучання — даволі проста. Абітурыентаў не хапае нават для запаўнення бюджэтных месцаў. Таму, напэўна, планы прыёму трэба пераглядаць.

А тым часам на фініш выходзіць прыёмная кампанія ў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах. Усяго на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 26,7 тысячы чалавек, з іх за кошт сродкаў бюджэту — 26,6 тысячы. Лічбы прыёму ў параўнанні з мінулым годам не толькі не зменшыліся, а, наадварот, крыху падраслі — прадстаўнікі рабочых прафесій заўсёды ў дэфіцыце.

На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўступная кампанія завяршаецца 18 жніўня, а на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай — 20 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інавацыі

# ПЛАТФОРМА — ДЛЯ НАВУЧАЛЬНЫХ ЗАДАЧ

**Праект «Лічбавы факультэт» рэалізоўваецца ў БДУ. Яго аўтары — прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі ўніверсітэта Канстанцін Казадаеў і загадчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій Юрый Варатніцкі.**

Ініцыятыва ўкаранёная на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. «Лічбавы факультэт» уяўляе з сябе адкрытую інтэлектуальную апаратна-праграмную анлайн-платформу, якая вырашае рэальныя задачы лічбавай трансфармацыі факультэта і ў той жа час даступная для рэалізацыі студэнцкіх стартапаў, выканання курсавых і дыпломных работ, магістарскіх дысертацый. Платформа аб'яднала навучальны воблачны цэнтр апрацоўкі даных, бесправадную сістэму тэлекамунікацый, навучальную сістэму відэаназірання і распазнавання струменевага відэа, сістэму апаратнага адлюстравання інфармацыі на маніторах у навучальным корпусе, навучальную сістэму бяспекі і маніторынгу стану аўдыторый.

Да адкрытых інтэрфейсаў інфраструктуры «Лічбавага факультэта» падключаны навучальныя лабараторыі глыбокага навучання, бяспекі камунікацыйных працэсаў, віртуальнай і дапоўненай рэальнасці, прамысловых сетак і інтэрнэту рэчаў.

Адукацыйны патэнцыял лічбавай платформы заключаецца ў свабодным выкарыстанні студэнтамі для сваіх праектаў яе інфраструктуры, прызначанай для вырашэння рэальных задач. Прыкладамі такіх праектаў з'яўляюцца распрацоўкі алгарытмаў генерацыі раскладаў заняткаў, праграм электроннага інфармавання на сеткавых дысплэях, маніторынгу тэмпературы, ціску і вільготнасці ў навучальных лабараторыях, кантролю наведвальнасці ў аўдыторыях. На дадзены момант на базе платформы «Лічбавы факультэт» і інтэграваных з ёй лабараторый выканана больш за 30 дыпломных і магістарскіх работ па актуальнай тэматыцы.

Інавацыйны праект плануецца рэалізаваць і на іншых факультэтах БДУ, дзе рыхтуюць спецыялістаў па інфармацыйных тэхналогіях.

Трэба дадаць, што распрацоўка БДУ атрымала высокую ацэнку экспертаў на Міжнародным форуме «ТІБО». За перспектыўнасць ідэі праект быў удастоены дыплома.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Правила проведения Рекламной игры

# «ВЫГОДНАЯ ПЕНСИЯ С ПРИОРБАНКОМ»

**1.** Настоящая рекламная игра называется **«Выгодная пенсия с Приорбанком»** (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

**2. Сведения об организаторе и заинтересованном лице.**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

**2.1.1.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**2.2.** Заинтересованным лицом Игры является «Приорбанк» Открытое акционерное общество, УНН 100220190 (далее – Заинтересованное лицо, «Приорбанк» ОАО, Банк).

**3. Территория проведения Игры** – Республика Беларусь.

**4. Период проведения Игры** – с 16.08.2021 по 06.01.2022, включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Состав комиссии по проведению Игры** (далее – комиссия):

**5.1.** Председатель комиссии – Калитник Татьяна Алексеевна – управляющий ООО «Яскрава».

**5.2.** Члены комиссии:

**5.2.1.** Суходольская Инна Викторовна, специалист по рекламной коммуникации 1 категории «Приорбанк» ОАО;

**5.2.2.** Трудолюбова Наталья Борисовна, экономист 1 категории «Приорбанк» ОАО;

**5.2.3.** Павлющик Инна Викторовна – индивидуальный предприниматель;

**5.2.4.** Бельская Анна Николаевна – ведущий специалист ООО «Яскрава».

**6.** Игра проводится в целях привлечения новых клиентов в рамках пенсионной программы и увеличения количества пенсионных счетов в белорусских рублях в «Приорбанк» ОАО.

**7. Участники Игры.**

**7.1.** Участниками Игры могут быть физические лица, граждане Республики Беларусь, имеющие право на получение пенсии в соответствии с законодательством Республики Беларусь при дополнительном предъявлении пенсионного удостоверения либо иного документа, подтверждающего право на получение пенсии в соответствии с законодательством Республики Беларусь, а также лица, обратившиеся в Банк не ранее чем за 3 календарных месяца до наступления общеустановленного пенсионного возраста в Республике Беларусь.

**7.2.** Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть участниками рекламной игры.

**8. Состав и размер призового фонда.**

*Таблица 1*

| № п/п | Наименование приза, участвующего в розыгрыше | Наименование приза далее по тексту | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 ед., бел. руб. с НДС | Сумма всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Телевизор Samsung LED UE43T5300AUXRU (ном. 330430, 330431) | Телевизор | 40 | 1380,00 | 55 200,00 |
| | +Денежная сумма | | 40 | 183,79 | 7 351,60 |
| 2 | Автомобиль Volkswagen Polo объем двиг. 1598 см³, цвет – белый, куз. № XW8ZZZCKZMG054460, г. в. 2021 РФ (ном. 329297) | Главный приз | 1 | 37 500,00 | 37 500,00 |
| | +Денежная сумма | | 1 | 5 581,03 | 5 581,03 |
| Сумма Призового фонда ИТОГО: | | | | | 105 632, 63 |

**8.1.** Призовой фонд Игры составляет 105 632,63 (сто пять тысяч шестьсот тридцать два) белорусских рубля 63 копейки и формируется за счет имущества и денежных средств Заинтересованного лица.

**9. Условия участия в Игре.**

**9.1.** Для участия в Игре необходимо не иметь по состоянию на 15.08.2021 действующего Договора текущего (расчетного) банковского счета «Пенсионный счет» с использованием карточки (платежных систем Visa International Service Association, MasterCard Worldwide, БЕЛКАРТ) (далее – Договор), а также в период с 16.08.2021 и не позднее 05.12.2021 включительно (далее – период участия):

- заключить на условиях «Приорбанк» ОАО Договор с одновременным оформлением заявления о перечислении пенсии в «Приорбанк» ОАО за один визит в Банк;
- не расторгать Договор до момента проведения розыгрыша Главного приза;
- при заключении Договора дать согласие на участие в Игре (принять соответствующее условие Договора).

Участниками Игры становятся физические лица, выполнившие все указанные условия.

**9.2.** При соблюдении условий, указанных в п. 9.1 Правил, каждый Участник получает один шанс на выигрыш приза «Телевизор» в соответствующем розыгрыше, согласно дате заключения Договора, и один шанс на выигрыш в розыгрыше Главного приза, в котором принимают участие все Участники.

**9.3.** Совершая действия для участия в Игре, участник дает согласие Организатору и Банку на использование персональных данных участника, в том числе их сбор, хранение, передачу, обработку и проверку, в рамках данной Игры, а также на получение уведомлений и рекламно-информационных сообщений от Банка и/или Организатора рекламной игры.

**9.4.** Не является основанием для участия в Игре нарушение участником условий, установленных п. 9.1. Правил, в т. ч. (но не ограничиваясь):

- заключение Договора ранее или позднее периода, указанного в п. 9.1. Правил;
- расторжение Договора в период проведения Игры;
- заключение Договора без оформления заявления о перечислении пенсии в «Приорбанк» ОАО.

**10. Порядок проведения розыгрышей призового фонда.**

Место проведения розыгрышей призов «Телевизор» – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

Место проведения розыгрыша Главного приза – г. Минск, пр. Независимости, 202.

Всего за период проведения Игры Организатором проводится 5 (пять) розыгрышей призового фонда согласно Таблице 3.

*Таблица 3*

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Призы розыгрыша | Кол-во призов | Период открытия счета |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 15.09.2021 14:00 | Телевизор | 10 | с 16.08.2021 по 12.09.2021 |
| 2 | 13.10.2021 14:00 | Телевизор | 10 | с 13.09.2021 по 10.10.2021 |
| 3 | 10.11.2021 14:00 | Телевизор | 10 | с 11.10.2021 по 07.11.2021 |
| 4 | 08.12.2021 14:00 | Телевизор | 10 | с 08.11.2021 по 05.12.2021 |
| 5 | 10.12.2021 14:00 | Главный приз | 1 | с 16.08.2021 по 05.12.2021 |

**10.3.** Для осуществления розыгрышей призов «Телевизор» и «Главный приз» Организатором формируются списки, включающие порядковые номера, дату заключения Договора, фамилию, имя, отчество (при наличии) участника. Порядковые номера (далее – «номера») присваиваются участникам в хронологическом порядке согласно дате заключения Договора, а при совпадении даты – в алфавитном порядке по фамилии, имени, отчеству (при наличии) участника, формируя массив участников (далее – «массив»).

**10.4.** Для определения выигрышных номеров для всех призов Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышного номера происходит путем его формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.5.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Из барабана извлекается один шар. Цифра на извлеченном шаре вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**10.6.** Далее в лототрон загружаются все 10 (десять) шаров, шары перемешиваются и из лототрона извлекается шар, цифра на котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и извлекается следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве.

**10.7.** В случае повторного выигрыша приза «Телевизор» одним и тем же участником, приз «Телевизор» переходит к следующему по списку участнику соответствующего розыгрыша.

**10.8.** Резервными Победителями становятся номера участников, следующие по списку за выигрышными. В случае если номер участника попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый номер иного участника с начала списка.

**10.9.** В розыгрыше Главного приза принимают участие все участники, в том числе выигравшие приз «Телевизор» в предыдущих розыгрышах Игры.

**10.10.** После определения Победителя Главного приза осуществляется определение 1 (одного) резервного победителя. Резервный победитель определяется в соответствии с пп. 10.4–10.6 Правил.

В случае если номер резервного победителя, определенный согласно пп. 10.4.–10.6. Правил, совпадает с уже зафиксированным номером победителя Главного приза, выигрышным считается номер, следующий за этим номером. В случае если номер участника попадает на конец списка, то выигрышным будет считаться первый номер иного участника с начала списка.

**11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.**

**11.1.** В течение 5 (пяти) рабочих дней после каждого розыгрыша Организатор уведомляет Победителей о выигрыше посредством звонка на номер телефона и по электронной почте, указанным при заключении Договора об открытии счета. Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей по почте заказным письмом на адрес регистрации, указанный Участником при открытии счета.

**11.2.** Победитель может получить выигранный им приз следующим образом:

**11.2.1.** Для Победителей, **проживающих в г. Минске** или **не проживающих в г. Минске, но желающих получить Приз путем самовывоза** по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 907: явиться в срок до 22.12.2021 (включительно) с 11:00 до 17:00 в рабочие дни либо с 11:00 до 13:00 в субботу 18.12.2021, предварительно созвонившись с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или направив письмо по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by, и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках игры (Ф.И.О., серия и номер паспорта (вида на жительство в Республике Беларусь), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство в Республике Беларусь), идентификационный номер, адрес регистрации).

**11.2.2.** Для Победителей, **проживающих не в г. Минске (за исключением получения Главного приза):** не позднее 21.12.2021 связаться с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by и отправить по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by до 22.12.2021 отсканированную копию документа, указанную в п. 11.2.1 Правил.

После получения вышеуказанных копий документа Организатор не позднее 28.12.2021 осуществляет за счет собственных средств доставку (почтой, курьерской службой, служебным транспортом и т. д.) призов победителям, проживающим не в г. Минске, по адресу, указанному победителем для доставки приза. Датой выдачи приза является дата передачи приза в соответствующую службу (почта, курьерская служба и т. д.) для его отправки победителю.

**11.3.** Если победитель не может получить приз лично, приз может получить в установленные сроки согласно пп. 11.2.1–11.2.2 Правил его доверенное лицо, уведомив об этом Организатора до 21.12.2021 по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by. При передаче приза доверенное лицо обязано предоставить лично Организатору:

- доверенность от победителя на получение приза, удостоверенную нотариально;
- документ, указанный в п. 11.2.1. Правил.

**11.4.** Приз «Телевизор» или «Главный приз» вручается Резервному Победителю в случае, если Победитель (основной):

- отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;
- нарушает (не выполняет) условия Правил (в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в порядке, установленном Правилами, отказывается от подписания необходимых документов);
- не является для получения приза в сроки, установленные Правилами.

**11.5.** В срок до 24.12.2021 (включительно) Организатор уведомляет резервных победителей о выигрыше посредством звонка на номер телефона либо по электронной почте, указанным при заключении Договора об открытии счета.

**11.6.** Резервный победитель может получить приз следующим образом:

**11.6.1.** Для резервных победителей, **проживающих в г. Минске** или **не проживающих в г. Минске, но желающих получить Приз самовывоза:** по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 907: явиться в срок до 29.12.2021 (включительно) с 11:00 до 17:00 в рабочие дни, предварительно созвонившись с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или направив письмо по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by, и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках игры (Ф.И.О., серия и номер паспорта (вида на жительство в Республике Беларусь), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство в Республике Беларусь), идентификационный номер, адрес регистрации).

**11.6.2.** Для резервных победителей, **проживающих не в г. Минске (за исключением получения Главного приза):** не позднее 28.12.2021 связаться с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by и отправить по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by до 29.12.2021 отсканированную копию документа, указанную в п. 11.6.1 Правил.

После получения вышеуказанных копий документа Организатор не позднее 06.01.2022 осуществляет за счет собственных средств доставку (почтой, курьерской службой, служебным транспортом и т. д.) призов победителям, проживающим не в г. Минске, по адресу, указанному победителем для доставки приза. Датой выдачи приза является дата передачи приза в соответствующую службу (почта, курьерская служба и т. д.) для его отправки победителю.

**11.6.3.** Если Резервный победитель не может получить приз лично, приз может получить в установленные сроки согласно пп. 11.6.1 – 11.6.2 Правил его доверенное лицо, уведомив об этом Организатора до 28.12.2021 по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты prior-igra@yaskrava.by. При передаче приза доверенное лицо обязано предоставить лично Организатору:

- доверенность от победителя на получение приза, удостоверенную нотариально;
- документ, указанный в п. 11.6.1 Правил.

**11.7.** Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**11.8.** При получении приза Победитель (Резервный победитель) несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза, дополнительной денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**11.9.** В случае если Победитель (как основной, так и Резервный), претендующий на получение приза, не обеспечивает соблюдение условий Правил (в т. ч. предусмотренных пп. 11.2, 11.3, 11.6), а также наступление обстоятельств, предусмотренных в п. 11.1 Правил, он теряет право получения Приза, а Приз остается в распоряжении Организатора.

**12. Права и обязанности участников Игры.**

**12.1.** Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением приза.

**12.2.** Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору.

**12.3.** Победитель (резервный победитель), претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения приза.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала проведения Игры.

**13.2.** Результаты розыгрыша Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 25.12.2021.

**14. Общие положения.**

**14.1.** Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, будут считаться окончательными и распространяться на всех участников.

**14.2.** Банк и любые его аффилированные лица (за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры), не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

**14.3.** Организатор не несет ответственность, если не по его вине у участника отсутствует доступ к сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет), электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с участником и т. д.), почтовой службы (сроки доставки и т. д.). Организатор не компенсирует участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении офиса Организатора.

**14.4.** Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375 (33) 696-17-16 с 11:00 до 16:00 в рабочие дни и с 10:00 до 13:00 в субботу, также по электронной почте prior-igra@yaskrava.by.

*Свидетельство о государственной регистрации № 4058 выдано 10.08.2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

13 жніўня 2021 г. № 31 (616)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ДОБРАЯ СПРАВА








# У ЧАВУСАХ З'ЯВІЛАСЯ «ТЭРЫТОРЫЯ АБ'ЯДНАННЯ»

## Стварэннем шматфункцыянальнай пляцоўкі займаліся амаль увесь мікрараён, дэпутаты і прадпрыемствы горада

**Сімвалічная назва «Тэрыторыя аб'яднання» — гэта не паказальны жэст у сувязі з Годам адзінства, а вынік карпатлівай работы мясцовых улад, дэпутатаў і насельніцтва па рэалізацыі маштабнага праекта, які рэалізоўваўся на працягу апошніх двух гадоў. Пляцоўка адкрылася ў мікрараёне Льнозавода — аднаго з самых аддаленых куточкаў горада. У савецкі час, калі гаспадарка была моцная і перспектыўная, тут будаваліся шматпавярховікі, стваралася інфраструктура. З развалам Саюза ўтрымліваць такую вялікую тэрыторыю ў належным стане стала цяжка. З'яўленне буйной спартыўна-забаўляльнай пляцоўкі стала сапраўднай падзеяй для жыхароў. Бо гэта быў зусім не тыповы вопыт. І, як паказала практыка, вельмі рэзультатыўны.**

*(Заканчэнне на 18-й стар.)*

АКТУАЛЬНА

# ЗВАРОТЫ ЛЮДЗЕЙ ЯК ІНДЫКАТАР ДАВЕРУ ДА ЎЛАДЫ

**Будаўніцтва ўнікальнай для Гомельшчыны ўстановы адукацыі — новай школы ў 96-м мікрараёне абласнога цэнтра — падыходзіць да завяршэння. Цікавасць да аб'екта, асабліва значнага для маладых сем'яў у раёне актыўнай жыллёвай забудовы, праяўляецца на рэспубліканскім узроўні. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас свайго нядаўняга візіту ў рэгіён пабывала на будоўлі і ацаніла маштабы ўзвядзення, па сутнасці, школьнага гарадка.**

Парламентарый адзначыла ўнікальнасць падобнага праекта не толькі для Гомеля і рэгіёна, але і для краіны ў цэлым — другой падобнай школы ў Беларусі няма. На тэрыторыі аб'екта, акрамя навучальнага корпуса, — два басейны, над якімі знаходзяцца спартыўныя, музычныя залы і для заняткаў харэаграфіяй, стадыён з пляцоўкамі для воркаўта, баскетбола, валейбола, а таксама дзіцячыя пляцоўкі. Трэба сказаць, што работы на пляцоўках не спыняюцца нават ноччу і па выхадных — тут задзейнічана каля 700 спецыялістаў. Цяпер на аб'екце завершаны мантаж жалезабетонных канструкцый, ідуць работы па адстройванні, мантаж абсталявання і ўстаноўка мэблі. Як адзначаецца, ніякіх збояў з пастаўкамі матэрыялаў няма. Стаіць задача цалкам здаць аб'ект ужо да першага верасня.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

АКЦЭНТЫ

# Медыцынская дапамога — максімальна хутка і эфектыўна

## Новыя магчымасці ў хуткім часе з'явяцца ў пятай сталічнай клініцы з уводам новых блокаў і лабараторыі



**З ходам будаўніцтва і рэканструкцыі днямі азнаёмілася Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, упаўнаважаная Прэзідэнта ў горадзе Мінску. Разам са спікерам верхняй палаты парламента ва ўстанову аховы здароўя завіталі міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ і старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ.**

Галоўны ўрач 5-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска расказаў аб тым, што зменіцца пасля яе рэканструкцыі. Паводле яго слоў, мадэрнізацыя бальніцы ідзе паэтапна, нядаўна ўвялі ў эксплуатацыю 9-павярховы неўралагічны корпус. Сучаснае абсталяванне значна палепшыла дыягностыку захворванняў. Другая чарга рэканструкцыі — лячэбна-дыягнастычны цэнтр, дзе размесціцца барацэнтр, эндаскапічнае аддзяленне і ізатопная лабараторыя. На стадыі будаўніцтва знаходзіцца яшчэ адзін корпус. Усё гэта робіцца для таго, каб па максімуме скарачаць час абследавання пацыентаў і своечасова аказаць неабходную дапамогу.

— Трэцяя чарга ў нас цяпер на стадыі будаўніцтва, і праз год мы павінны яе здаць да канца года, — растлумачыў **галоўны ўрач 5-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Міхаіл НАЗАРЧУК**. — Там будуць знаходзіцца прыёмнае аддзяленне, аперацыйны блокі, рэанімацыйнае аддзяленне і дыягнастычны цэнтр. Будуць стаяць два магнітна-рэзанансныя тамографы, камп'ютарны тамограф, у прынцыпе ўся дыягностыка. Пабудавана вельмі добрая лагістыка: усё будзе знаходзіцца ў прыёмным аддзяленні — не трэба нікуды вазіць пацыентаў, усё на месцы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Пад'езд да вёскі будзе забяспечаны

**У Савет Рэспублікі звярнуліся жыхары вёскі Вішнёўка Мінскай вобласці са сваёй праблемай — уладкавання дарогі да вёскі.**

Высвятленнем сутнасці справы заняліся ў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Як паведамілі ў профільнай камісіі са спасылкай на інфармацыю Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, у цяперашні час вядуцца праектна-пошукавыя работы і рыхтуецца адпаведная дакументацыя. Плануецца, што праектныя работы будуць завершаны ў бягучым годзе.

Адзначым, што гэтае пытанне вяскоўцаў будзе знаходзіцца на кантролі ў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні да яго канчатковага вырашэння.

# ЗВАРОТЫ ЛЮДЗЕЙ ЯК ІНДЫКАТАР ДАВЕРУ ДА ЎЛАДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Між тым, паказальная рэалізацыя менавіта гэтага сацыяльна значнага аб'екта Гомельшчыны і як вынік актыўнай работы са зваротамі жыхароў абласнога цэнтра, з маладымі сем'ямі, што пражываюць у 96-м мікрараёне Гомеля.



Нагадаем, што ў 2019 годзе з просьбай пабудаваць новую школу на Хутары — пад такой назвай больш вядомы сярод гамяльчан 96-ы мікрараён — да кіраўніцтва рэгіёна паступілі звароты ад гараджан. Новая навучальная ўстанова ў гэтым буйным раёне новабудоўляў сапраўды была вельмі неабходная. Летась у жніўні кіраўнік рэгіёна прыехаў на Хутар з важнай навіной: доўгачаканай школе — быць. У пачатку бягучага года на месцы будоўлі распачалі ўзвядзенне падмурка школы.

Менавіта на пытанні зваротаў грамадзян як «індыкатара даверу да органаў улады» была засяроджана асаблівая ўвага Наталлі Качанавай на сустрэчы з кіраўніцтвам Саветаў дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўняў падчас візіту ў Гомель.

— Схіляюся да таго, што нават рост зваротаў — гэта індыкатар даверу да ўлады. Да вас ідуць людзі, бо чакаюць дапамогі і вераць, што ім дапамогуць. Важна заўсёды адказна ставіцца да гэтай работы, а галоўнае — памятаць, што ніхто лепш за вас не ведае сітуацыю на месцах і не зможа вырашыць праблему лепш, чым вы. Трэба ўмець слухаць і чуць людзей. Ні адзін зварот не павінен застацца без увагі — гэта архіважна. Бо многія звяртаюцца з выпакутаванымі пытаннямі, якія іх турбуюць, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. Яна заклікала дэпутатаў рабіць усё, каб людзі на месцах адчувалі сябе патрэбнымі.

Сярод тэм, якія таксама былі акрэслены на сустрэчы з дэпутацкім корпусам Гомельшчыны, — стварэнне камфортных умоў для жыхароў як вялікіх гарадоў, так і малых сельскіх населеных пунктаў. Акрамя таго, Наталля Качанава ўзняла пытанне актуальнасці інфармацыйнай палітыкі. Важная задача — не дапусціць, каб розная кшталту інфармацыйныя ўкіды выкарыстоўваліся для дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне.

Асобны акцэнт Старшыня Савета Рэспублікі зрабіла на актуальнасці і важнасці работы з моладдзю: заўважаць перспектыўных і ініцыятыўных маладых людзей на месцах, даваць ім поле для дзейнасці, давяраць адказныя даручэнні і пасады.

— За намі павінна ісці пакаленне неабыякавых і ўпэўненых людзей, якія будуць працягваць нашы пачынанні, — падкрэсліла спікер.

Сустрэча Наталлі Качанавай з кіраўніцтвам Саветаў дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўняў у Гомелі доўжылася каля дзвюх з паловай гадзін. Былі дадзены канкрэтныя рэкамендацыі наконт дзейнасці народных абраннікаў.

— Савет Рэспублікі заўсёды адкрыты да дыялогу. Мы гатовыя выслухаць усе прапановы, прыняць неабходныя рашэнні. Прашу, не адкладвайце і не зацягвайце разгляд нават, на першы погляд, дробных праблем. Заўсёды і ва ўсім важная аператыўнасць, — сарыентавала дэпутатаў старшыня Савета Рэспублікі, падагульняючы сустрэчу.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ КОЖНАМУ

**Савет Рэспублікі правёў у сталіцы адзіны дзень асабістага прыёму грамадзян. Падчас яго сенатарам паступіла больш за 300 зваротаў — як ад мінчан, так і ад жыхароў іншых рэгіёнаў краіны. Абсалютная большасць — 196 пытанняў — адрасаваліся спікеру верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ (аб яе прыёме «Звязда» пісала ў суботнім нумары). Аднак было нямала і тых, хто скарыстаўся сваім правам задаць пытанне старшыням Пастаянных камісій Савета Рэспублікі і іх намеснікам, якія правялі прыёмы грамадзян ва ўсіх адміністрацыях сталіцы.**

Так, **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА** правёў прыём у адміністрацыі Ленінскага раёна. Усяго сенатар разгледзеў больш як 20 зваротаў.

— У Мінскай вобласці больш зваротаў датычылася зямельных пытанняў і будаўніцтва жылля, рамонту пад'язных шляхоў, дачных кааператываў, а ў Мінску ў асноўным — кватэрных: арэнды жылля, добраўпарадкавання пад'ездаў, а таксама адносін паміж жыхарамі.

Напрыклад, да Анатоля Ісачанкі звярнуліся жыхары шматкватэрнага дома № 21 па вуліцы Козыраўскай Наталля Сідарэнка і Уладзімір Мялько. Паміж імі і іх суседам завязалася спрэчка. Справа аказалася банальная: сусед робіць у сваёй кватэры капітальны рамонт і такім чынам стварае нязручнасці іншым. Наталля і Уладзімір палічылі гэтыя дзеянні неправамернымі і папрасілі разабрацца. Для вырашэння пытання па даручэнні намесніка Старшыні Савета Рэспублікі на месца ў хуткім часе выедзе камісія, якая падрабязна вывучыць праблему і падрыхтуе адпаведнае заключэнне.

Пытанні, з якімі прыходзілі грамадзяне да Анатоля Ісачанкі, былі рознабаковыя. Яны датычыліся аплаты жыллёва-камунальных паслуг, садзейнічання ва ўстанаўленні групы інваліднасці, дапамогі ў пошуку работы і іншага. Цікавіліся і тым, якія мерапрыемствы рэалізоўваюцца дзяржавай у Год народнага адзінства, а таксама як плануецца захоўваць гістарычную памяць пра гераічнае мінулае беларускага народа.

На прыём да сенатара прыходзілі з заканадаўчымі ініцыятывамі. Анатоль Ісачанка заўважыў: «Неабыякавыя грамадзяне ўносяць свае прапановы па паляпшэнні дзеючага заканадаўства, і гэта мы выкарыстоўваем у нашай рабоце. Такое ўзаемадзеянне дазваляе хутка вырашаць грамадска значныя пытанні. Сказаць, што ўсё можна вырашыць адразу, напэўна, няправільна. Аднак кожнага, хто да нас прыходзіць, імкнёмся выслухаць і яму дапамагчы».

Адказвалі і вырашалі хвалюючыя пытанні грамадзян сенатары ва ўсіх раённых адміністрацыях сталіцы.

Напрыклад, **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** правёў асабісты прыём грамадзян у Савецкім раёне. Да сенатара звярнуліся з пытаннямі наконт сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя, землекарыстання, работы транспарту, стварэння безбар'ернага асяроддзя і іншага. Усяго да парламентарыя звярнулася 12 чалавек.

На асобныя звароты старшыня Пастаяннай камісіі даў тлумачэнні падчас прыёму; пытанні, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяў на кантроль.

Віктар Ліскові адзначыў, што для вырашэння актуальных праблем грамадзян парламентарыі плануюць і ў далейшым праводзіць сустрэчы з насельніцтвам у фармаце адзінага дня прыёму.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** адзіны дзень прыёму грамадзян правёў у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска. Асноўныя тэмы, што хвалююць людзей, — паляпшэнне жыллёвых умоў, добраўпарадкаванне тэрыторый, грамадскі парадак, экалогія.



Трэба сказаць, што па многіх пытаннях, якія прагучалі падчас прыёму, парламентарыі былі дадзены неабходныя тлумачэнні. Шэраг тэм узяты на кантроль.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** сустрэўся з заяўнікамі ў Заводскім раёне сталіцы.

Жыхары Мінска звярталіся да сенатара па пытаннях, што датычацца ўдасканалення заканадаўства, пенсійнага забеспячэння, землекарыстання, паляпшэння жыллёвых умоў, забеспячэння правапарадку і іншых. Усяго на прыём да парламентарыя прыйшлі 10 чалавек.

На асобныя звароты Сяргей Сівец даў тлумачэнні падчас прыёму, а тыя пытанні, што патрабуюць дадатковага вывучэння, знаходзяцца на кантролі.



Падводзячы вынікі асабістага прыёму, сенатар адзначыў, што ў Савеце Рэспублікі робіце са зваротамі грамадзян аддаецца вялікая ўвага. Фармат адзінага дня прыёму добра сябе зарэкамендаваў. Падобныя сустрэчы ўжо прайшлі ў Мінскім раёне і Віцебскай вобласці. Таксама Сяргей Сівец (як член Савета Рэспублікі ад горада Мінска) звярнуў увагу на тое, што кіраўніцтва Заводскага раёна заўсёды аператыўна рэагуе на праблемы грамадзян. У прыватнасці, у гэты дзень на прыём звярнулася жыхарка дадзенага раёна па пытанні прыборкі прыдамовай тэрыторыі пасля капітальнага рамонту дома. Кіраўнікі раёна ўжо арганізавалі работу па добраўпарадкаванні тэрыторыі і паабяцалі завяршыць яе як мага хутчэй.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар ЧАЙЧЫЦ** свой асабісты прыём грамадзян правёў у Цэнтральным раёне сталіцы.

Парламентарый расказаў, што людзі звяртаюцца з самымі рознымі пытаннямі — юрыдычнымі і бытавымі — адным словам, з жыццёвымі праблемамі. Паступілі звароты з прапановамі аб змяненні заканадаўства. Усім растлумачаны механізм вырашэння пытанняў. У выпадках, калі патрабуецца дадатковае вывучэнне вялікай колькасці дакументаў, заяўнікі былі накіраваныя да канкрэтных спецыялістаў.

Некаторыя грамадзяне прыходзілі да парламентарыя са словамі падзякі. Напрыклад, Фрыда Лосева падзякавала Віктару Чайчыцу за раней аказаную дапамогу ў вырашэнні пытання, звязанага з атрыманнем кампенсацыі вязням фашысцкага гета, і ўручыла кнігі пра генацыд супраць беларускага народа, выдадзеныя на многіх мовах свету і апублікаваныя ў розных краінах.

Грамадзяне звярнуліся таксама з ініцыятывай аб ахове і навядзенні грамадскага парадку. Так, жыхары вуліцы Камсамольскай заявілі, што гатовыя аказваць садзейнічанне «Зялянбуду» ў захаванні дрэў, і ўнеслі прапанову аб арганізацыі грамадскага парадку з улікам вялікай колькасці пунктаў грамадскага харчавання на гэтай вуліцы.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік начальніка кадрынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Марына ІЛЬНА** правяла выязны асабісты прыём грамадзян у адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска.

Людзей хвалявалі пытанні дзейнасці жыллёва-камунальнай гаспадаркі і паляпшэння жыллёвых умоў, землекарыстання і адукацыі. Таксама былі ўнесены прапановы па змяненні заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Падчас прыёму парламентарыем дадзены неабходныя тлумачэнні, шэраг пытанняў узяты на кантроль.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Сваё кіно

# Канфлікт інтарэсаў і вопыту

Вячаслаў Нікіфараў — з ліку тых, хто нарадзіўся не ў Беларусі, але менавіта тут знайшоў прастору для творчай рэалізацыі: як рэжысёр, акцёр, педагог. Ён вядомы па фільмах «Бацькі і дзеці», «Душа мая, Марыя», «Хлеб пахне порахам», «Высакародны разбойнік Уладзімір Дуброўскі», «Тум-Пабі-Дум», «На безыменнай вышыні» і многіх іншых. У дзень нараджэння творцы 13 жніўня сацыякультурны тэлеканал пакажа яго кінастужку 1976 года «Сын старшыні».

Сам рэжысёр распавядаў неяк, што беларуская сталіца ў ім заўсёды добра адгукалася. Першы раз ён наведаў Мінск, калі студэнтам прыехаў сюды на здымкі кіно.



А праз час Вячаслаў Аляксандравіч вярнуўся сюды працаваць над уласнай кінастужкай — «Бераг прынцэсы Люські». Затым з'явіўся яго фільм «Зімародак» (1972), і рэжысёр застаўся працаваць на «Беларусьфільме».

Тут жа, на кінастудыі, убачыла свет і яго кінагісторыя «Сын старшыні», якую здымалі ў Бабруйску. Сацыяльна-псіхалагічная драма нагляднa паказвае сітуацыю, калі погляды прадстаўнікоў розных пакаленняў не супадаюць. У цэнтры сюжэта канфлікт бацькі і сына: Якаў Русак хоча сысці на заслужаны адпачынак і бачыць сваім наступнікам на пасадзе старшыні ўласнага сына Аляксея, які ўжо зусім па-іншаму глядзіць на свет і ацэньвае праблемы вёскі і сельскай гаспадаркі. Праўда ў кожнага, вядома, свая, бо і жыццёвы вопыт розны. Аднак за кім пойдуць людзі? Даведаемся ў суботу на «Беларусь 3». Фільм запланаваны да паказу ў 10.35 і ў 15.50.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 126**

Аўтар задачы ***(гл. дыяграму)***, вядучы беларускі шахматны кампазітар Віктар Волчак, гэтым летам адзначыў 55-гадовы юбілей. Віншуем!



**Белыя:** Кра8, Лh6, Се6, Cg7, Kb7, Kc4, пd5 (7).

**Чорныя:** Крс7, Kd6 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Два эцюды прапанавалі нам Віктар Жук *(г. Брэст)* і Васіль Тупік *(Пружанскі раён)*.

№ 1.

**Белыя:** Кра2, Ле5, пп. b3, c3, d5, g5 (6).

**Чорныя:** Крb5, Лf1, Kd3, пп. c4, c7, e7 (6).

**Выйгрыш.**

1. d6+ К:е5 2. de cb+ 3. Кр:b3 Лb1+ 4. Крс2 Лb2+ 5. Kpd1 Лd2+ 6. Kpc1 Ле2 7. е8Ф+.

№ 2.

**Белыя:** Кра6, Ла2, Ch7, пп. b2, h5, h6 (6).

**Чорныя:** Крс5, Лс1, пп. d5, d7, g2 (5)

Выйгрыш.

1. b4+ Кр:b4 2. Лb2+ Кра4 3. Л:g2 Лс6+ 4. Kpb7 Л:h6 5. Cg6.

* * *

У мінулым выпуску мы распавялі, як беларускія шахматысты выступілі на Кубку свету ў Сочы. А выйграў спаборніцтва 23-гадовы польскі гросмайстар Ян-Кшыштаф Дуда. У паўфінале ён перамог дзеючага чэмпіёна свету Магнуса Карлсена *(Нарвегія)*, а ў фінале — былога віцэ-чэмпіёна свету Сяргея Каракіна *(Расія)*. М. Карлсен у матчы за трэцяе месца адолеў расійскага гросмайстра Уладзіміра Федасеева з лікам 2:0. Вось гэтыя паядынкі.

Уладзімір Федасееў — Магнус Карлсэн.

1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. h4 Cg7 4. Kc3 d6 5. e4 Kc6 6. d5 Ke5 7. Ce2 h5 8. Cf4 0-0 9. Kf3 K:f3+ 10. gf c6 11. Фd2 cd 12. cd Kph7 13. a4 Kd7 14. a5 f5 15. Ла3 Ke5 16. Ce3 f4 17. C:f4 Cd7 18. Kd1 Л:f4 19. Ф:f4 Ch6 20. Фg3 Фf8 21. Ke3 Cf4 22. Фg2 Лс8 23. Лс3 Л:с3 24. bc Фc8 25. c4 b5 26. ab ab 27. Фg1 Фа8 28. Kpf1 Фа2 29. Kg2 Фа1+ 30. Ke1 Фb2 31. Kg2 Фc1+ 32. Ke1 Фd2 33. Фg2 Kpg7 34. Лg1 Kpf8 35. Фh1 e6 36. Лg3 ed 37. ed Cf5 38. Лg1 Kpf7 39. Лg3 Kd7 40. Лg5 C:g5 41. hg Ke5, 0:1.

Магнус Карлсэн — Уладзімір Федасееў.

1. e4 c6 2. d4 d5 3. e5 Cf5 4. c4 e6 5. Kc3 Cb4 6. cd Ф:d5 7. Kge2 Фd8 8. a3 Ca5 9. Kg3 Ke7 10. Cc4 Cg6 11. h4 h6 12. h5 Ch7 13. Фg4 Kpf8 14. 0-0 Kd7 15. Kce4 Cc7 16. Ca2 Kf5 17. K:f5 C:f5 18. Фf3 Фe7 19. Kg3 Ch7 20. Фg4 c5 21. Cd2 Лd8 22. f4 Kb6 23. Cc3 Kd5 24. f5 Ke3 25. Фf3 K:f5 26. K:f5 C:f5 27. d5 Cb6 28. Cc4 Kpg8 29. d6 Фh4 30. b3 Лd7 31. Фe2 Фg4 32. Л:f5 Ф:f5 33. Лf1 Фg5 34. Cd2 Фd8 35. Фg4 a6 36. Л:f7 Кр:f7 37. Ф:e6+ Kpf8 38. Фf5+ Kpe8 39. Фg6+ Kpf8 40. Фf5+ Kpe8 41. Фg6+ Kpf8 42. e6 Фf6 43. ed Ф:g6 44. hg Cd8 45. Ce6 h5 46. Kpf2 h4 47. Cg4 b5 48. Kpf3 b4 49. ab cb, 1:0.

У жаночым Кубку першае месца заняла экс-чэмпіёнка свету Аляксандра Касцянюк *(Расія)*, якая перамагла ў фінале дзеючую віцэ-чэмпіёнку Аляксандру Гарачкіну *(таксама Расія)*. У матчы за трэцяе месца экс-чэмпіёнка свету Тан Чжун'і *(Кітай)* выйграла ў вядомай украінскай шахматысткі Ганны Музычук. Дарэчы, раней у жаночых шахматах пераможцы гэтых турніраў атрымлівалі тытул чэмпіёнкі свету, але нядаўна Міжнародная шахматная федэрацыя змяніла статус спаборніцтва, і Кубак свету стаў толькі прыступкай да паядынку за сусветную карону.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Cc5! (2. Лf7, 3. Ф:f6x) Kg4+ 2. fg+, 1... Kd7 2. Ce6, 1...e5 2. Лb6. Не вядзе да мэты 1. Лf7? (2. Ф:f6) Kf4 2. Cc5, але 1... Kpe5! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Інтэлектуальныя квэсты ў тэлеэфіры

**Праверыць удачу і ўласным розумам здабыць перамогу над сапернікамі — аснова разнастайных праграм, якія дазваляюць выпрабаваць сябе ў інтэлектуальным плане, а магчыма, яшчэ і атрымаць узнагароду. Такія праграмы — «даўнія знаёмыя» ў тэлеэфіры: «Што? Дзе? Калі?», «Поле цудаў», «Слабае звяно», «Хто хоча стаць мільянерам» і іншыя. Калі ж звярнуцца да праектаў вытворчасці айчыннага тэлебачання, то і тут знойдуцца цікавыя нагоды праверыць уласную эрудыцыю і пахварэць за любімыя каманды на экране.**






На «Беларусь 2» штонядзелю можна пабудаваць **«Вежу»** ў інтэлектуальна-забаўляльным праекце, дзе спаборнічаюць яркія і эрудзіраваныя беларусы. Па правілах праекта, у кожным выпуску ўдзел бяруць дзве каманды ў складзе трох чалавек. І ў ходзе гульні правільныя адказы ў трох бліц-апытаннях даюць балы, а калі каманда памыляецца, то будуе «вежу» са спецыяльных элементаў. І калі канструкцыя акажацца нетрывалая — можна страціць усе заробленыя балы. У выпадку ж перамогі каманда атрымлівае вандроўку да адной са знакамітых вежаў у Еўропе. Нядрэнны стымул прадэманстраваць уласныя веды, пагадзіцеся.




Шоу **«Я ведаю!»** на «Беларусь 1» з'яўляецца сумесным праектам Белтэлерадыёкампаніі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яго мэта — знайсці і даць магчымасць заявіць пра сябе разумным, смелым і кемлівым школьнікам. Праграма дазваляе прадэманстраваць кожнаму ўдзельніку свае веды і раскрывае вучнёўскія таленты, што нярэдка хаваюцца за вялікай колькасцю прачытаных кніг, а гэта, у сваю чаргу, часам здзіўляе не толькі іх аднагодак, але і дарослых, якія не заўсёды могуць даць адказы на пастаўленыя пытанні. Каманды ўдзельнікаў фарміруюцца ў выніку папярэдніх адбораў вучняў у школах, раёнах. Аднак тут для вырашэння крэатыўных заданняў мала ведаць толькі школьную праграму — патрэбныя агульная дасведчанасць і ўменне арыентавацца ў розных навуках. Дарэчы, праект дае магчымасць раскрыцца не толькі вучням, але і іх настаўнікам, якія рыхтуюць дзяцей да ўдзелу ў шоу. Педагогі разам з бацькамі і «групамі падтрымкі» бяруць удзел у здымках праекта.

А вось на тэлеканале «Беларусь 3» ёсць тэлевіктарына **«Сваімі словамі»**, якая запрашае тэлегледачоў праверыць свае веды па роднай мове, культуры і гісторыі. Удзельнікі адказваюць на цікавыя пытанні, дэманструючы веданне мовы, літаратуры, этнаграфіі, мастацтва. Пры гэтым яны праяўляюць не толькі свой розум, але і вытрымку, рашучасць, уменне дзейнічаць у камандзе і будаваць стратэгіі.

Як бачым, ёсць выбар для тых, хто любіць веды і назапашваць, і дэманстраваць іншым, каб у тэлеаўдыторыі быў стымул самаўдасканальвацца.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.30, 8.30** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.20, 8.20** Навіны эканомікі.
**7.25, 8.25** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Меладрама «З кім павядзешся» (16+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Меладрама «Не адпускай» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Сэнс жыцця (12+).
**17.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**18.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў (16+).
**22.50 Меладрама «Кашмарны дырэктар, або Школа № 5» (16+).**
**2.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» Ранішняе шоу (12+).
**9.00, 16.55** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10** «На нажах» (16+).
**11.10, 18.25 Серыял «Клетка для цвыркуна» (16+).**
**13.15** «Тры першыя спатканні» (16+).
**14.05** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**14.45** «Арол і рэшка. Перазагрузка-3» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00 «Клон». Серыял (16+).**
**17.55** «Калі мы дома-2» (16+).
**20.25, 21.15** «Вяселле ўсляпую» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.40 Драма «Адораная» (12+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Пасахі.
**8.05, 12.00, 20.20, 21.10** Навіны культуры.
**8.25, 18.00 «Арлова і Аляксандраў». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.10, 16.55** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**10.25 «Кіндэрвілейскі прывід». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**12.20** «Сіла веры».
**12.50, 21.05** «Апошні дзень». Вія Артманэ (12+).
**13.25, 21.40 «Мачаха». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**14.50** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**15.15 «Кіндэрвілейскі прывід». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**17.10** «Кадры жыцця». Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Чарнышоў.
**19.50** «Артэфакты». Унікальны ўзор ручнога ткацтва — кунтушовы пояс слуцкага тыпу [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**6.55** Гандбол. Таварыскі турнір. СКА-Мінск — «Пермскія Мядзведзі».
**8.30, 14.20** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету сярод юніёраў. Найробі.
**11.00** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Харватыя — Швейцарыя.
**13.10** Аўтаспорт. Экстрым-Е
**13.45** Свет англійскай прэм'ер-лігі
**16.20** Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Беларусь — Сальвадор.
**17.35** Вось гэта спорт!
**17.55, 20.10** Спорт-цэнтр.
**18.05** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Італія — Беларусь.
**20.20** Пляжны футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Бразілія.
**21.20** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Расія — Францыя.
**22.50** Гандбол. Таварыскі турнір.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.50** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 22.50 Серыял «І ўсё ж такі я кахаю...» (16+).**
**15.05, 16.45** «Давай пажэнімся!» (16+).
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**17.35, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** Музычны фестываль «Жара» ў Маскве (12+).

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны»
**9.00, 0.10** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.40 «Ілюзіі». Серыял (12+).**
**11.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.30, 1.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 21.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**16.50** Дакументальны спецпраект (16+).
**17.45 «Пераможцы». Серыял (12+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**20.45** «Таямніцы Беларусі».

## МІР

**5.00, 3.55** Мультфільмы (0+).
**5.25 Маст. фільм «Цырк» [СЦ] (0+).**
**6.55, 10.10 Серыял «Забудзь і ўспомні» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.20 Маст. фільм «Вій» [СЦ] (12+).**
**19.15** «Слабое звяно» (12+).
**20.25 Маст. фільм «Зямля Саннікава» (0+).**
**22.25 Маст. фільм «Алігарх» (16+).**
**1.05 Маст. фільм «Катала» (0+).**
**2.25 Маст. фільм «Таямнічы востраў» (12+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.40 Серыял «Дуэт па праве» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.40** «Кропкі над «і» (16+).
**17.15** «60 хвілін»
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).

**20.45** Урачыстае адкрыццё Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў «Новая хваля-2021».
**23.10 Маст. фільм «Нядачлівы» (12+).**
**0.50** «Лёс чалавека» з Барысам Карчэўнікавым (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 21.55, 23.00** Сёння. Галоўнае.
**6.10 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата» (16+).**
**7.25** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.50** Маршрут пабудаваны (12+).
**9.25** Сэнс жыцця (12+).
**10.20 Серыял «Ляснік» (16+).**
**12.15** Гісторыі выратавання (12+).
**12.45, 13.45 Серыял «Пасяленцы» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**15.45, 16.25, 19.50 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**21.00, 22.00 Маст. фільм «Проста Джэксан» (16+).**
**23.15 Серыял «Шэф» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.30, 19.55, 21.05, 1.25** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультсерыял «Трансформеры прайм» (6+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Весела і гучна» (12+).**
**8.25 Серыял «Мандалорац» (12+).**
**9.35, 15.00 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**10.20 Серыял «Пакістан» (12+).**
**11.05 Камедыя «Маёр Пэйн» (12+).**
**12.40 Серыял «Пэры Мэйсан» (12+).**
**13.35 Серыял «У цемры» (16+).**
**14.35** «Мультпарад». «Фарсаж» (6+).
**15.45** «Гатуй як шэф» (12+).
**16.00 Серыял «Чорнае каханне» (16+).**
**17.30 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.30 Серыял «Востраў непатрэбных людзей» (16+).**
**20.00 Серыял «Бандыцкі Пецярбург» (16+).**
**20.55** «Вечарніца». «Пчолка Мая» (0+).
**21.10 Фантастыка. «Апошнія Джэдаі» (16+).**
**23.40 Серыял «Крывавая пані» (16+).**

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**10.10** «Лаві момант» (16+).
**10.50** Камедыя «Астэрыкс і Абелікс: місія Клеапатра»
**12.55** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.00** Серыял «Вароніны» (12+).
**18.00** Серыял «Госці з мінулага» (16+).
**20.00** Серыял «Гатэль «Элеон» (16+).
**21.00** Камедыя «Пацучыныя скачкі»
**23.10** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**0.00** Серыял «Мамачкі» (16+).
**1.00** Серыял «Гальгін.ru» (16+).
**2.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.40** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.55** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Пешшу...» Масква палацавая.
**7.00** Легенды сусветнага кіно. Людміла Гурчанка.
**7.30** «Загадкі старажытнага Егіпта». Дак. фільм [СЦ].
**8.15** «Амерыканская трагедыя». Маст. фільм [СЦ].
**9.30** «Іншыя Раманавы» [СЦ].
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** Пернікавы домік. «Іванаўскія сітцы».
**10.45** Academia. Сяргей Богачаў.
**13.45** «Людзі і страсці Алісы Фрэйндліх». Дак. фільм.
**14.30** «Таямніца скрыпічнай душы».
**15.05** «Загадкі Старажытнага Егіпта». Дак. фільм [СЦ].
**15.55** «Асабістае шчасце». Маст. фільм [СЦ].
**17.05** «Доктар Вараб'ёў. Перачытваючы аўтабіяграфію».
**17.35, 1.00** Майстры вакальнага мастацтва. Вольга Барадзіна.

**18.15, 2.25** Раман у камені. «Растоў-на-Доне. Асабнякі Парамонавых». Дак. фільм.
**18.50** Замежная справа. «Вялікі пасол».
**19.45** 100 гадоў з дня нараджэння Галіны Каратке-віч. «Мая вялікая вайна». Дак. фільм. [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Адлюстраваны час». Дак. серыял. «Што ж гэта было? (Тунгускі метэарыт)».
**21.15** «Амерыканская трагедыя». Маст. фільм [СЦ].
**22.30** Колер часу. Міхаіл Урубель.
**22.40** Прыступкі цывілізацыі. «Загадкі старажытнага Егіпта». Дак. фільм [СЦ].
**23.50** «Шахеразада». Серыял.
**1.45** Замежная справа. «Гаспадыня Еўропы».

## Настальгія

**6.00** Фільм-спектакль «Адыходзячы, азірніся...»
**8.15** «Ранішняя пошта».
«Розныя думкі» (12+).
**8.40, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 19.35, 21.40, 0.50, 2.50, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** Фільм-спектакль «Шчыгрынавая скура».
**14.20** «Музыка ў тэатры, у кіно, на ТБ» (12+).
**18.00** Тэлеспектакль «Да новых сустрэч!»
**19.55** «Вітражных спраў майстар» (12+).
**23.00** Дак. фільм «Я вяртаю ваш партрэт» (12+).
**0.00** Дак. фільм «Дзеці XX з'езда» (16+).
**1.05** Рытмічная гімнастыка (12+).
**1.35** Маст. фільм «Сяброўка мая».
**5.20** «Блеф-клуб» (16+).

## EuroSport 1

**0.30** Аўтаспорт. Тэлечасопіс «24 гадзіны Ле-Мана» — 2020 (16+).

**2.15** Аўтаспорт. Суперкубак Porsche. Венгрыя. Гонка (16+).
**2.30, 6.00, 9.30, 13.30, 15.50, 21.10** Веласпорт. «Вуэльта» (16+).
**4.00, 11.00** Снукер. British Open. Першы круг (6+).
**8.00** Аўтагонкі на вынослівасць. «6 гадзін Монцы» (16+).
**13.25** Тэлечасопіс The Minute (12+).
**18.45** Гонкі на вынослівасць. Тэлечасопіс Wheels & Heels (16+).
**19.15** Тэлечасопіс «Дарога ў Ле-Ман» (16+).
**19.45, 22.00, 22.50** Аўтагонкі на вынослівасць. «24 гадзіны Ле-Мана»

## Кінакамедыя

**0.55** «Дзядуля лёгкіх паводзінаў» (18+).
**2.45** «Зноў у школу» (16+).
**4.30** «Пампушка» (16+).
**6.35** «Каханне здараецца» (16+).
**8.35** «Дзень сурка» (12+).
**10.30** «Таксі» (16+).
**12.10** «Таксі-2» (16+).
**13.45** «Нягледзячы ні на што» (16+).
**15.50** «Аслеплены жаданнямі» (16+).
**17.30** «Таўстун на рынгу» (12+).
**19.30** «Паліцэйскі з Рублёўкі. Навагодняе бязмежжа» (16+).
**21.15** «Аналізуй гэта» (16+).
**23.10** «Старая добрая оргія» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**7.45** «13» (16+).
**9.40** «Перыскоп» (16+).
**10.00, 4.30** «Суд ідзе». Дакументальны серыял (16+).
**11.00** «Паралельны свет» (12+).
**12.00, 18.25, 2.50** «Сляпая» (16+).
**13.05, 19.35** «Варажбітка» (16+).
**13.40, 3.45** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.40** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.20** «Суд ідзе» (16+).
**16.20** «Невядомы». Серыял (16+).

**20.45** «Блудны сын». Серыял (16+).
**22.35** «Грань». Серыял (16+).
**23.40** «Глядзі сам» (16+).
**23.55** «10 самых» (16+).
**0.30** «Лінія абароны» (16+).
**1.05** «Паветраны маршал» (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** «Доктар Хаус» (16+).
**6.35** «Дзённікі нянькі» (16+).
**8.25** «Цуд» (12+).
**10.35** «Місія: невыканальная» (12+).
**12.40** «Місія: невыканальная-3» (12+).
**15.00** «Місія: невыканальная-2» (12+).
**19.00** «Поле бітвы — Зямля» (16+).
**21.05** «Пампеі» (12+).
**23.00** «Місія невыканальная: пратакол Фантом» (12+).
**1.20** «Місія невыканальная: племя ізгояў» (16+).
**3.20** «Місія невыканальная: наступствы» (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.55** «Гадзіна пік» (16+).
**7.55** «Ржэў» (12+).
**10.05** «Бітва за Севастопаль» (12+).
**12.15** «Чэмпіёны» (6+).
**14.05** «Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней» (6+).
**15.55, 16.55, 18.00, 18.55** «Нюхач» (16+).
**19.55** «Неадэкватныя людзі» (16+).
**21.55** «Неадэкватныя людзі-2» (16+).
**0.05** «Любі іх усіх» (18+).
**1.50** «Чырвоны прывід» (16+).
**3.25** «9 рота» (16+).

## National Geographic

**6.00, 6.15** Код небяспекі (16+).
**6.35** Гульні розуму (16+).
**7.25** Асушыць акіян: глыбокае апусканне (16+).
**8.15** Ледзяная дарога (16+).
**9.05** Востраў бунтароў (16+).
**9.55** Мегазаводы (16+).
**10.50** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.40, 21.00, 2.50, 4.20** Дзікі тунец (16+).

**12.30, 16.45** Наркавойны (16+).
**13.15** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**14.10** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога-3 (16+).
**15.05** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**15.55** Турэмныя цяжкасці (16+).
**17.40** Служба бяспекі аэрапорта: першы клас (16+).
**18.25** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**19.15, 20.10** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.45** Тэхаскі ўлоў (16+).
**22.40, 23.30** Аўта-SOS (16+).
**0.20** 80-я (16+).
**1.10** Антарктыка (16+).
**2.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
**3.30** Акцыдэнт акіян (16+).
**5.15, 5.40** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 17.42** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**8.46, 11.25, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 10.06, 20.24, 20.51** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**10.32, 10.59, 21.18, 21.45** Як гэта ўладкавана? (12+)
**12.18** Узрываючы гісторыю (12+).
**13.12** У пошуках Атлантыды (12+).
**14.06, 15.00, 15.54** Разбуральнікі легенд: кастынг (16+).
**18.36, 19.03** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.30, 4.15** Хуткія і гучныя (12+).
**23.06, 5.45** Выжыць разам (16+).
**0.00, 6.30** Сысці ад пагоні (12+).
**0.54, 7.15** Хакер у дзікай прыродзе (16+).
**1.47, 2.14, 2.40, 3.05, 3.30, 3.53** Дзіўны свет жывёл (12+).
**5.00, 5.23** Як гэта зроблена? (16+)

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# СЛУЖЫЦЬ АЙЧЫНЕ ШЧЫРА

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ узяў удзел у пасяджэнні адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска.**

На парадку дня былі меры па супрацьдзеянні карупцыі, якія прымаюцца ў раёне, а таксама вынікі вясновага прызыву ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь у лютым — маі і задачы па яго правядзенні восенню 2021 года, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Нагадаем, што супрацьдзеянне карупцыі — адзін з важных напрамкаў дзейнасці дзяржаўных органаў любога ўзроўню. І трэба сказаць, што прыма-емыя ў краіне меры значна ўзмацнілі антыкарупцыйную накіраванасць заканадаўства, вызначылі асноўныя формы яе папярэджання.

Як паведамілі на пасяджэнні адміністрацыі раёна, прэвентыўныя меры па барацьбе з карупцыяй дазволілі не дапусціць росту колькасці эканамічных злачынстваў у Ленінскім раёне з пачатку года, тым не менш, парламентарый звярнуў увагу на наяўныя рэзервы ў такой рабоце. У прыватнасці, гаворка аб пашырэнні прафілактычных мерапрыемстваў, павышэнні прававой культуры кіраўнікоў, стварэнні ў працоўных калектывах абстаноўкі ўзаемнай патрабавальнасці і адказнасці. Ён рэкамендаваў праваахоўным і кантралюючым органам сумесна з кіраўніцтвам прадпрыемстваў і арганізацый узмацніць кантроль за правядзеннем дзяржзакупак, законнасцю размеркавання і выкарыстання бюджэтных сродкаў.

Тэма прызыву на тэрміновую службу актуальная не толькі для Ленінскага раёна, але і для ўсёй краіны ў сувязі са спробамі знешніх і ўнутраных дэструктыўных сіл разбурыць нашу дзяржаву.

— У абстаноўцы знешняга ціску, які толькі ўзмацняецца, павялічваецца значнасць умацавання абароназдольнасці, павышэння якасці падрыхтоўкі прызыўнікоў да службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, — адзначыў Сяргей Рачкоў. — Сёння мы ўсе зацікаўленыя ў тым, каб на службу ў войска прыходзілі маладыя людзі, здольныя з годнасцю і гонарам выканаць свой канстытуцыйны абавязак па абароне Айчыны.

> У абстаноўцы знешняга ціску, які толькі ўзмацняецца, павялічваецца значнасць умацавання абароназдольнасці, павышэння якасці падрыхтоўкі прызыўнікоў да службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, — адзначыў Сяргей Рачкоў. — Сёння мы ўсе зацікаўленыя ў тым, каб на службу ў войска прыходзілі маладыя людзі, здольныя з годнасцю і гонарам выканаць свой канстытуцыйны абавязак па абароне Айчыны.

Сенатар падкрэсліў, што неабходна весці работу па павышэнні эфектыўнасці патрыятычнага выхавання школьнікаў і падрыхтоўкі грамадзян да тэрміновай ваеннай службы. У гэтым пытанні важнае месца павінна адводзіцца аб'яднанню намаганняў школы, сям'і і грамадскіх арганізацый. Таксама мэтазгодна павышаць прэстыж тэрміновай ваеннай службы, у тым ліку шляхам унясення неабходных змяненняў у заканадаўства.

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

# Роля дэпутата, добраўпарадкаванне і жніво

## Сенатары працягваюць работу са зваротамі грамадзян

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ наведала Старадарожскі раён Міншчыны.**

Кіраўнік прадстаўнічай улады рэгіёна правяла сустрэчу са старшынямі мясцовых сельсаветаў, дзе звярнула ўвагу на ролю сельскіх Саветаў у добраўпарадкаванні малой радзімы, вырашэнне бягучых праблем, з якімі звяртаюцца мясцовыя жыхары, і іншыя актуальныя пытанні.

Парламентарый таксама наведала мехдвор ААТ «Палажэвічы». Яна ўручыла камбайнеру Валерыю Санкевічу Ганаровую грамату Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, адзначыўшы вялізны ўнёсак хлебаробаў у дабрабыт роднага краю.

Днямі **член Савета Рэспублікі Валянцін БАЙКО**, абраны ад Гродзенскай вобласці, правёў прамую лінію. Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня агульнага сходу заснавальнікаў СТАА «Кантэ Спа» адказваў на пытанні жыхароў Ваўкавыскага, Мастоўскага і Шчучынскага раёнаў Панямоння — свайго выбарчай акругі. Падчас прамой лініі парламентарыем былі дадзены неабходныя тлумачэнні, расказалі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, шэраг пытанняў былі ўзяты на кантроль.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, **дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО** правёў прамую лінію для жыхароў Мазыра і Мазырскага раёна. Людзі задавалі пытанні, якія датычыліся малацьбы збожжа ў асабістых падсобных гаспадарках, паслуг арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі, рамонту жылых памяшканняў, працаўладкавання і іншага. Парламентарый даў неабходныя тлумачэнні заяўнікам, некаторыя пытанні ўзяў на кантроль.





**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў Тамара ШАТЛІКАВА** правяла выязны прыём грамадзян у Бухавіцкім сельсавеце. Трэба сказаць, што ўзнятыя пытанні, якія датычыліся працоўных і зямельных праваадносін, былі вырашаны падчас правядзення прыёму.

Жывая гутарка атрымалася і ў **члена Савета Рэспублікі Сяргея АНЮХОЎСКАГА** падчас яго рабочай паездкі ў Слаўгарадскі раён, што на Магілёўшчыне. Тут член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктар ААТ «Чырвоны харчавік» правёў выязны прыём грамадзян, павіншаваў перадавіка жніва і наведаў вытворчую пляцоўку.

Падчас прыёму грамадзян, які прайшоў у райвыканкаме, парламентарый пагутарыў з жыхарамі, даведаўся аб праблемах, з якімі ім давялося сутыкнуцца. Трэба сказаць, што ўсе агучаныя пытанні ўзятыя на кантроль. Адміністрацыя раёна падзякавала сенатару за падтрымку і дапамогу, якая аказваецца жыхарам.

Пасля размовы з заяўнікамі разам з прадстаўнікамі мясцовай улады парламентарый павіншаваў кіроўцу ААТ «Слаўгарад-райаграпрамтэхніка» Мікалая Старавойтава з высокімі паказчыкамі на ўборцы збожжавых культур — ён перавёз звыш тысячы тон зерневых.

У гэты ж дзень сенатар наведаў пляцоўку ВГУП «Чырвоны харчавік-Слаўгарад», дзе цяпер вядзецца мантаж новай лініі па вытворчасці жавальных цукерак і мармеладу. Пусканаладачныя работы плануецца пачаць у лістападзе.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

МЕРКАВАННЕ

# «Мы вельмі шмат ужо зрабілі ў заканадаўстве, каб папярэдзіць магчымасць паўтарэння поствыбарных падзей»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Савета Рэспублікі Сяргей СІВЕЦ у размове з журналістамі паведаміў, што лейтматывам «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» стаў аналіз падзей, якія адбыліся падчас і пасля мінулых выбараў кіраўніка краіны.**

«Мы вельмі шмат ужо зрабілі ў заканадаўстве, каб папярэдзіць магчымасць паўтарэння тых падзей. У нас сістэмна змянілася большасць заканадаўчых актаў — Крымінальны кодэкс, Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях, законы аб масавых мерапрыемствах, СМІ. Гэта адбылося за кароткі тэрмін», — сказаў Сяргей Сівец.

Пры гэтым ён дадаў, што засталіся праблемныя моманты, якія сёння не ўрэгуляваны заканадаўствам і стаяць на парадку дня. Напрыклад, наданне статусу замежнага агента, супрацьдзеянне заклікам да санкцый супраць нашай дзяржавы.

«На мой погляд, парламентарыі чакалі, што Прэзідэнт агучыць сваю пазіцыю па гэтых пытаннях і задасць вектар далейшага развіцця нашай прававой сістэмы», — адзначыў сенатар.

Карыстаючыся магчымасцю, журналісты папрасілі Сяргея Сіўца як члена Канстытуцыйнай камісіі пракаментаваць, на якой стадыі знаходзіцца работа.

«Праект Канстытуцыі, апублікаваны на сайце Круглага стала дэмакратычных сіл Юрыем Васкрасенскім, — вядома, не той варыянт, які павінен быць сёння прадметам дыскусіі. Гэта рабочы варыянт. Па шэрагу пазіцый у членаў Канстытуцыйнай камісіі ёсць прынцыповыя разыходжанні. Колькасць выказаных заўваг па праекце — сведчанне таго, што работа ў самым разгары», — паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве верхняй палаты парламента.

Разам з тым ён заявіў, што не трэба забывацца — Прэзідэнтам жорстка пастаўлены тэрміны падрыхтоўкі праекта Асноўнага закона. Таму рэдакцыйная група Канстытуцыйнай камісіі ў паскораным рэжыме стараецца зняць наяўныя заўвагі, каб аператыўна перадаць праект на разгляд кіраўніку краіны.

Сяргей Сівец звяртае ўвагу: многія прапановы, што прагучалі на дыялогавых пляцоўках, былі ў лістах грамадзян, датычацца ключавых раздзелаў Канстытуцыі. Большасць — чацвёртага раздзела, які фармалізуе і фіксуе асновы палітычнай сістэмы дзяржавы.

«На парадку стаіць і пытанне надання канстытуцыйнага статусу Усебеларускаму народнаму сходу. Безумоўна, гэтыя пытанні патрабуюць усебаковай прапрацоўкі і вельмі складаныя з пункту гледжання юрыдычнай тэхнікі. Іх неабходна абмяркоўваць у сістэме, інтэграваць УНС такім чынам у палітычную сістэму дзяржавы, каб гэта не прывяло да нейкага дысбалансу сярод іншых дзяржаўных органаў. Неабходна дакладна размяркаваць паўнамоцтвы паміж выканаўчай, заканадаўчай, судовай уладамі, Прэзідэнтам. Гэта вельмі складаная, карпатлівая работа», — мяркуе сенатар.

Па словах парламентарыя, вельмі ідэалістычна ўспрымаць, што такая адказная дзейнасць не пацягне за сабой значных заўваг і праблемных момантаў, якія запатрабуюць дадатковага часу.

«Але работа далёка за экватарам, набліжаецца да свайго лагічнага завяршэння. Зразумела, вопыт дзяржаўнага будаўніцтва, які напрацаваны, павінен быць усебакова прааналізаваны. Нам трэба паглядзець, як на будучае мы зможам залажыць палажэнні, якія будуць стратэгічным шляхам нацыянальнага развіцця нашай дзяржавы на дзесяцігоддзі. Бо Канстытуцыя павінна быць балансам, стабілізуючым фактарам нашага развіцця, і не дапускаць канстытуцыйна-прававых крызісаў паміж галінамі ўлады», — рэзюмуе Сяргей Сівец.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Дажынкі» пройдуць, а прыгажосць застанецца

**Сёлета ў Падзвінні абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі пройдзе ў Шуміліне. Па сутнасці, гэта прыгарад Віцебска, да якога ўсяго прыкладна сорак кіламетраў.**

Штаб па падрыхтоўцы да «Дажынак-2021» узначальвае **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ**. Кіраўнік абласнога парламента заклікае дэпутатаў розных узроўняў актывізаваць удзел у падрыхтоўцы да свята. І было зроблена нямала, каб вывучыць пажаданні жыхароў раёна наконт таго, якія горадабудаўнічыя змены неабходныя ім. Заўсёды трэба выслухваць меркаванні людзей, улічваць заўвагі, калі яны аргументаваныя. А поспех у рэалізацыі вялікіх праектаў — у зладжанасці каманднай работы, упэўнены дэпутат.

Гарадскі пасёлак прыгажэе літаральна з кожным днём. Мясцовыя жыхары ўдзячныя ўладзе за ўвагу да іх населенага пункта. І гэта не проста прыгожыя словы. Людзі разумеюць, што перамены — не дзеля справаздачы, а ўсё робіцца на дзесяцігоддзі.

Тутэйшыя старажылы не памятаюць, каб калісьці раней так маштабна (адразу ў дзясятках месцаў з раніцы да ночы) працавалі сотні будаўнікоў, азеляняльніка, сувязістаў і гэтак далей.

Да «Дажынак» каля стапяцідзесяці аб'ектаў — у райцэнтры і глыбінцы — капітальна рамантуецца, атрымлівае больш прывабны выгляд; будуюцца новыя.

Усяго для таго, каб сталіца «Дажынак» выглядала годна, плануецца скарыстаць каля 28 мільёнаў рублёў. Гэтыя вялікія грошы — з абласнога (18 мільёнаў) і раённага бюджэтаў, а таксама сродкі прадпрыемстваў і арганізацый раёна, плюс зароблены жыхарамі рэгіёна падчас суботніка. А рэспубліканскія субсідыі накіроўваюць на рамонт дарожнага пакрыцця вуліц, што з'яўляюцца часткай рэспубліканскіх і мясцовых трас.

Толькі на тое, каб Шуміліна стаў «кветкавым горадам» (з прыгожым азеляненнем, клумбамі-карцінкамі, скульптурамі), вылучана больш за 61,5 тысячы рублёў.

**Старшыня Шумілінскага райвыканкама Віктар ГУТАРАЎ** канстатуе, што робіцца ўсё магчымае, каб рэалізаваць задуманае поўнасцю, своечасова і якасна.

Сярод буйных аб'ектаў, якія атрымаюць другое жыццё, — шумілінскі стадыён. Каля пяцідзесяці гадоў там не праводзілі вялікіх будаўнічых работ. А да «Дажынак» ён стане адным з найлепшых у Віцебскай вобласці, на ім можна будзе праводзіць нават рэспубліканскія спаборніцтвы. Адначасова за гульнёй футбалістаў на полі з новым пакрыццём змогуць назіраць дзвесце гледачоў. Абнавілі хакейную пляцоўку, абсталявалі пляцоўкі для занятказ на трэнажорах, для воркаўта. Мадэрнізавалі бібліятэку, паліклініку, раённы Цэнтр культуры і гэтак далей.

Наогул, робіцца многае, каб у школах Шуміліна ўмовы былі не горшыя, чым у абласным цэнтры. Адметна, што каля пятнаццаці жылых дамоў і пад дваццаць двароў капітальна рамантуецца.

Наступныя «Дажынкі» пройдуць у Глыбокім, а потым сталіцай свята стане Шаркаўшчына.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў упэўнены, што падрыхтоўка да фестывалю працаўнікоў вёскі спрыяе станоўчым зменам у раёнах, паралельна мясцовыя работнікі сельскай гаспадаркі павышаюць вытворчыя паказчыкі. Зразумела, сорамна станавіцца гаспадарамі свята, калі аграпрамысловы комплекс не на вышыні. Дарэчы, сёлета на Шумілiншчыне ўраджай збяруць большы, чым летась.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# У ЧАВУСАХ З'ЯВІЛАСЯ «ТЭРЫТОРЫЯ АБ'ЯДНАННЯ»

## Першы крок

Што рабіць, калі праблем шмат? Адназначна — з чагосьці пачынаць іх вырашаць. Каардынатарам стала **дэпутат райсавета Алена Максімовіч — дырэктар Чавускай бібліятэчнай сеткі**. Мікрараён Ільнозавода — якраз яе выбарчая акруга. Насельніцтва ўскладала на народную абранніцу вялікія надзеі, бо праблем сапраўды было шмат.

— Пачалося ўсё з першага сходу, на які сабралася шмат жыхароў, — успамінае яна свае першыя дні ў ролі дэпутата. — Мікрараён знаходзіцца на адлегласці 5-6 кіламетраў ад горада. На сённяшні дзень з сацыяльных аб'ектаў тут засталіся, лічы, толькі крама і дзіцячы садок. Былі пытанні па рамонце дарог і дамоў, арганізацыі месца адпачынку. Мы са старшынёй райсавета Анатолем Мацюліным прааналізавалі ўсё і вырашылі пачынаць менавіта са стварэння дзіцячай пляцоўкі. Бо дзяцей у мікрараёне шмат — больш за сто, а на тэрыторыі не было нават, мякка кажучы, арэляў. Гэта і было агучана на чарговым сходзе. Прычым з умовай, што людзі дапамогуць сваім непасрэдным удзелам. І нас падтрымалі.

Да збору сродкаў падключыліся маладыя маці. Сход быў у канцы лета, а да вясны ўжо назбіралася амаль тысяча рублёў. Хапіла на тое, каб заказаць мясцовым умельцам арэлі-балансір, пясочніцу, дзве альтанкі. Мясцовае прадпрыемства «Мір ільну», якое цяпер базіруецца на плошчах былога льнозавода, дапамагло разраўняць пляцоўку па вуліцы Гагарына, якую арганізатары ўзгаднілі з мясцовай уладай, прывезці тое гульнявое абсталяванне, якое было зроблена. Сектар культуры райвыканкама арганізаваў працоўны дэсант, каб усё гэта ўстанавіць. Далучыліся і мясцовыя прадпрымальнікі, з'явіліся сродкі на фарбы. Насельніцтва натхнёна наводзіла на пляцоўцы марафет. Адным словам, першы крок быў зроблены.

## Другі крок

Дадатковыя сродкі атрымалася прыцягнуць за кошт удзелу ў некалькіх праектах. У рамках конкурсу, які быў аб'яўлены Асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў, пашчасціла ўвайсці ў пяцёрку пераможцаў і купіць невялічкі гульнявы комплекс — горачку з арэлькамі. Але хацелася чагосьці больш значнага. І ўдзел у конкурсе аднаго з праектаў па развіцці тэрыторый дапамог гэтага дасягнуць.

— На адным з пасяджэнняў асацыяцыі выступіў кіраўнік праекта, — расказвае Алена Максімовіч. — І мы вырашылі падключыцца. Разам з жыхарамі дамовіліся ўдасканаліць нашу дзіцячую пляцоўку і зрабіць на ёй нешта і для дарослых. Усім жа хочацца дзесьці адпачыць. Ініцыятыву назвалі «Тэрыторыя аб'яднання». Заявілі шматфункцыянальны комплекс, які ўключаў у сябе зону адпачынку са сцэнай пад адкрытым небам для канцэртаў і сходаў, трэнажоры, пешаходныя сцежкі ўнутры самой пляцоўкі, азеляненне, карусель для дзяцей, лаўкі, кветнікі, уваходную групу з назвай праекта. Ініцыятыва была настолькі незвычайная і ўсёабдымная, што была падтрыманая. Мы не маглі паверыць, калі даведаліся, што перамога і прызавы фонд — нашы. Як потым высветлілася, арганізатарам конкурсу спадабалася арыгінальнасць нашай ідэі, тое, што яна ахоплівала ўсіх — і дзяцей, і моладзь, і людзей сталага веку.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)



На ўмовах праекта прадугледжана сафінансаванне з боку партнёраў. А гэта яшчэ дадатковыя грошы — тысячы долараў. Раённую арганізацыю Беларускага саюза жанчын, праз якую была пададзена заяўка на ўдзел у конкурсе, падтрымалі раённы орган мясцовага самакіравання мікрараёна льнозавода, раённы Савет дэпутатаў, сектар культуры Чавускага райвыканкама, прадпрыемства «Мір ільну», жылкамгас, лясгас, раённы камітэт БРСМ і іншыя. Актыўны ўдзел бралі жыхары мікрараёна.

— Праект даў магчымасць лепш зразумець нашых жыхароў, — кажа Алена. — У нас было каля 10 акцый па выраўноўванні пляцоўкі, пасадцы дрэў, устаноўцы абсталявання, навядзенні парадку. Каля 70 чалавек пастаянна ўдзельнічала ва ўсіх гэтых работах. І кожны чымсьці дапамагаў. Нехта прыносіў фарбы, нехта — саджанцы, нехта — расаду. Мы ўзнагародзілі ўсіх — і партнёраў, і валанцёраў. Усім вялікі дзякуй!

## Крок трэці

Па сутнасці, прэзентацыя пляцоўкі — і ёсць вынікова ў дадзеным праекце крок. Гэта было вялікае свята з мастацкай самадзейнасцю, танцамі, спевамі, гульнямі. І малыя, і дарослыя выпрабоўвалі новае абсталяванне, радаваліся, што ёсць нарэшце месца, якое можа іх аб'яднаць. Адбыўся нават невялічкі фуршэт з салодкім кавуном, ліманадам і печывам для дзяцей. На памяць засталіся сотні здымкаў і яркіх уражанняў.

— Жыхароў гэта так натхніла, што яны закідваюць мяне новымі ідэямі, — смяецца Алена Максімовіч. — Вырашана і далей развіваць згаданую пляцоўку, а яшчэ ўзяцца за добраўпарадкаванне былога стадыёна. Ён у нас пакуль не вельмі дагледжаны, там амаль нічога са спартыўных снарадаў няма. Так што працэс працягваецца.

— Алена Уладзіміраўна — вельмі адказны і дзейны дэпутат, — кажа **прадстаўніца органа мясцовага самакіравання мікразоны «Льнозавод» Раіса АЎРАМЕНКА**. — Мы і раней разам з неабыякавымі жыхарамі мікрараёна рабілі нейкія конкурсы, невялічкія святы, але з яе прыходам усё стала больш сур'ёзна. Яна змагла аб'яднаць нават дзяцей. Стварыла ў сацсетках групу, куды ўключыла іх, і яны там абменьваюцца інфармацыяй. Калі трэба сабрацца, ніякіх праблем няма. Раней актыўнасць праяўлялі ў асноўным жанчыны, але падчас работы над пляцоўкай далучылася і шмат мужчын. Бо там і пясок прыходзілася цягаць, і абсталяванне ўстанаўліваць. Гэтая справа сапраўды нас злучыла. І цяпер з раніцы да вечара на пляцоўцы людна. Прыемна, што наша тэрыторыя становіцца больш утульнай і прыгожай. Акрамя пляцоўкі, у нас ёсць шмат аб'ектаў, зробленых з непасрэдным удзелам жыхароў. Сёлета, напрыклад, мы пасадзілі невялічкі пладовы сад з 20 яблынь. У нас шмат кветнікаў, якія мы залажылі без удзелу тых жа камунальнікаў. Наш раён хоць і аддалены, але тут жыве шмат зараджаных на прыгажосць людзей. І не перабольшу, калі скажу, што да нас ужо трэба прыязджаць пераймаць вопыт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з газеты «Іскра».**

### Каментарый у тэму

**Старшыня Чавускага райсавета дэпутатаў, старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН:**

— Мікрараён Ільнозавода — крыху адарваная ад горада зона, і тут сапраўды існавалі складанасці з арганізацыяй культурнага адпачынку людзей. Спачатку жыхары звярнуліся да нас з патрабаваннем «нам гэта трэба», але скончылася ўсё дэмакратычным: «мы гэта зробім разам». Мы разам шукалі спосабы рэалізацыі іх пажаданняў, прыцягвалі сродкі асацыяцыі, грошы адмысловага конкурсу. Дапамагалі і прыватныя прадпрыемствы, і дзяржаўныя. Мы зрабілі прыгожую зону адпачынку з невялічкім амфітэатрам, альтанкамі, трэнажорамі і для дзяцей, і для дарослых. Гэтая пляцоўка нас усіх аб'яднала. На адкрыцці наш дэпутат Алена Максімовіч ушанавала каля 70 тутэйшых актывістаў. Яны вельмі ініцыятыўныя, спаборнічаюць у конкурсах на найлепшы пад'езд, найлепшую тэрыторыю. Гэта сапраўды было сапраўднае свята дружбы і адзінства.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2021 года.

# «КАЛІ СЭРЦА І ДУША ГЛУХІЯ, НЕ АДЧУВАЮЦЬ НІ БОЛЮ, НІ РАДАСЦІ — НЕ ПІШЫ, НЕ ДАДЗЕНА»

## Як пішуцца сучасныя дэтэктывы

**Дэтэктыў даўно перастаў лічыцца забаўляльным жанрам — праз пакручастую сюжэтную лінію можна гаварыць пра вельмі сур'ёзныя рэчы... Дэтэктывы беларускага пісьменніка Віктара ПРАЎДЗІНА менавіта такія: за «экшэнам» — развагі аб праблемах грамадства, духоўным выбары, які кожны мусіць рабіць штодзённа... «Візіцёр з Поўначы», «Эксгумацыя», «Шлях на Галгофу», «Танцавальны марафон», «Нелюбімыя гінуць», «Вяртанне з апраметнай»...**
**Напісанае зойме, мусіць, не адну паліцу. Нядаўна ў выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла чарговая кніга Віктара Праўдзіна «Парыж, Эйфелева вежа і...» Але гаворку з аўтарам мы пачалі не з літаратуры, а з яе вытокаў.**



***— Вы сцвярджалі, што няма ніводнага чалавека ў свеце, які быў бы раўнадушны да жывых ведаў пра сваіх продкаў... Пра сваіх шмат цікавага даведаліся?***

— На тое ён і чалавек, каб ведаць свае карані. Хто я? Адкуль? Хто мае продкі?.. Нарэшце, на каго характарам і вонкава падобныя сам і дзеці?... Гэтыя пытанні прымушаюць шукаць адказы — і, вядома, найперш бацькі распавядаюць аб сабе, дзядулях, бабулях... Калі ж хтось захоча сысці ад адказаў, то ёсць школа. У бытнасць маёй вучобы ў пачатковых класах такога не было, а цяпер дзеці і ўнукі малююць генеалагічнае дрэва, то-бок выконваюць школьную праграму, што вельмі добра.

Асабіста мяне цікавасць да ўсяго, што звязана з сям'ёй, прымушала не толькі ставіць пытанні, але часта і дапытвацца, нават вышукваць адказы. Было недастаткова ведаць імёны: Аляксандр, Рыгор і Хрыстафор, Ульян, Фёдар, Іван... І гэта толькі па лініі бацькі. Яны нарадзіліся і, акрамя майго бацькі, жыццё пражылі ў Архангельскай губерні. Але ж на долю бацькі і дзядоў выпала бараніць Радзіму падчас Вялікай Айчыннай вайны, браць удзел у фінскай і Першай сусветнай войнах. Наогул, адкуль сям'я Праўдзіных з'явілася ў глухой паўночнай тайзе падчас кіравання Расійскай імперыяй Пятром Вялікім? Пра гэта мог бы расказаць згаданы прапрапрадзед Іван. Мог бы, але да мяне дайшлі толькі паданні...

***— Вы — былы марак... Ці былых маракоў не бывае? Як адлюстравалася служба на флоце ў творах, як паўплывала на вашыя характар і лёс?***

— Згодзен, былых маракоў не бывае, як не бывае былых дэсантнікаў, пагранічнікаў, танкістаў, лётчыкаў. Запытайцеся ў кожнага вайскоўца любога роду войскаў, і яны вам адкажуць тое самае. Армія — выдатная школа жыцця, і той, хто сягоння сіліцца пераканаць у адваротным, прынамсі, хітруе, прыкрывае асабістыя маральныя, духоўныя ці якія іншыя недахопы, напрыклад, баязлівасць. Армія, ваенна-марскі флот ператварае юнакоў у сапраўдных мужчын, у абаронцаў Айчыны, прывучае да дысцыпліны, выхоўвае пачуццё адказнасці, павагі да старэйшага пакалення. Той, хто служыў тэрміновую службу, ведае цану сапраўднага сяброўства... Во!.. Сказаў так, як, пэўна, і сёння скажа кожны зампаліт... Але гэта праўда, я адказваю за свае словы, бо ў тым перакананы, сам прайшоў флоцкую школу жыцця. І сёння для мяне іншага выбару не існуе: калі раптам служыць тэрміновую службу — толькі ў ВМФ.

Рашэнне прысвяціць жыццё службе ў міліцыі і быць падобным на героя з кнігі «Сяржант міліцыі», якую напісаў Віль Ліпатаў, было прынята ў нейтральных водах Балтыйскага мора на палубе супрацьлодачнага карабля. І, вядома, у сваёй творчасці я звяртаўся і звяртаюся да падзей, што са мной адбыліся падчас службы. Памятаю сяброў, перагортваю флоцкі альбом — і маладосць вяртаецца...

***— Напэўна, вашы дэтэктыўныя творы заснаваныя на ўласным досведзе работы... Але крымінальная хроніка часта пераўзыходзіць любую фантазію. Ці шмат было выпадкаў, якія ператвараліся ў літаратурныя сюжэты? Ці было, што апісвалі рэальны выпадак, а гэта лічылі вымыслам?***

— Адкажу адным сказам: калі б я не служыў у Ваенна-марскім флоце, не быў міліцыянерам Шаркаўшчынскага РАУС, не вучыўся ў Вышэйшай школе міліцыі МУС СССР і не служыў на розных пасадах, асабліва старшым участковым Першамайскага РАУС г. Мінска, — не было б і літаратара Віктара Праўдзіна. Можа, сказаў задужа эмацыянальна, нават пафасна, але тое праўда. Вельмі цяжка пісаць неперажытае, але і перажытае кімсьці хоць сто, хоць тысячу гадоў таму, калі той боль прапускаеш праз сваю душу, сэрца, — твор адбудзецца. Калі сэрца і душа глухія, не адчуваюць ні болю, ні радасці — не пішы, не дадзена.

Сухая крымінальная хроніка заўсёды жорсткая і трагічная. Там няма сантыментаў, але ж на тое і пісьменнік, каб абысці жорсткія факты і зрабіць твор чытэльным. Для мяне здзейснены ўчынак — ужо другаснае, мае значэнне толькі прычына. Што датычыцца фантазіі... Асабіста для мяне гэтага тэрміна ў чыстым выглядзе не існуе. Аўтар можа так абазначыць раман, аповесць ці апавяданне, скласці сюжэт, прыдумаць невядомых цяперашняму свету істот і прыроду. Ён робіць гэта для пэўнага кола чытачоў, і зямныя чалавечыя адносіны, дабро, зло, здрада, шантаж, каханне і іншае — аўтар абавязкова пакажа ў творы. Падзеі могуць адбывацца ў космасе, на вадзе і пад вадой — зрэшты, дзе душа пажадае, але іншых адносін не існуе, акрамя вядомых нам, людзям... Фантазіі — прыкрыты, а часта і непрыкрыты камуфляж, за якім схаваныя вядомыя аўтару здарэнні, і ён, аўтар, прапануе чытачу асабістую версію падзей, што адбыліся ў наш час ці шмат гадоў таму, а часта асабістыя жаданні пераносяцца ў будучыню.

І гэта цудоўна — галоўнае, каб нас, літаратараў, чыталі і тыя, ад каго залежыць жыццё сягонняшняе. І не проста чыталі, а яшчэ звяралі градус напружання ў грамадстве. Мы балюча рэагуем, прапускаем праз сябе боль, надзеі, думкі, жаданні людзей усіх сацыяльных груп і пішам пра гэта... пішам... пішам...

Сюжэтны вымысел, блізкі да праўды, зразумела, прысутнічае. Напрыклад, у адным са сваіх раманаў я напісаў пра карабель з дзесяццю тонамі наркотыкаў, які перасякаў Атлантычны акіян і нечакана прапаў. Кніга выйшла — і во, неспадзяванка! Чытаю ў газеце крымінальную хроніку, і ажно дух захапіла. Гэткі ж карабель, з той самай краіны, што апісаў, насамрэч прапаў у Атлантыцы. Праўда, я памыліўся ў адным: карабель перавозіў не дзесяць, а пятнаццаць тон той брыдоты. І гэта не адзіны выпадак...

***— Пісьменнік Васіль Хомчанка, які працаваў ваенным пракурорам, прызнаваўся, што пісаў у кабінеце, у перапынках паміж пасяджэннямі... Як пісалася вам падчас работы ў месцах, не звязаных з літаратурай, і якое для вас ідэальнае рабочае месца?***

— Там, дзе пішацца, там і самае лепшае месца. Даводзілася пісаць і ў ванным пакоі. Збіў некалькі дошак, паставіў машынку-друкарку — вось табе і месца. Па-іншаму на той момант і быць не магло. Маленькія дзеці вымагалі цішыні... На службе нават падумаць пра літаратуру не мог. На творчасць заставаліся рэдкія выхадныя, ноч і штогадовы адпачынак. Калі пайшоў у адстаўку, з гэтым пытаннем стала лягчэй. У «Нёмане», «Полымі», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», у Саюзе пісьменнікаў Беларусі ў мяне быў свой кабінет! Заставаўся пасля работы і пісаў. Цяпер у мяне ёсць лецішча ў вёсцы Панфілаўшчына, стол каля акна, стос чыстай паперы, камп'ютар і слоўнікі... Месца добрае, але мара пра асабісты кабінет для творчасці так і засталася марай.

***— Колькі факталагічнага ў рамане «Нелюбімыя гінуць»? І ці будзе працяг?***

— Адразу хачу сказаць, што назву рамана «Нелюбімыя гінуць» падарыў мне Алесь Жук, выдатны празаік і чалавек. Я ніколі не сяду за пісьмовы стол і не пачну працаваць над творам, калі ў мяне няма назвы. Памятаю свой стан, мая істота аж закіпала ад падзей, фактаў, інфармацыі, а выхаду не знаходзіла, бо не было галоўнага — назвы. Алесь Жук, на той час галоўны рэдактар часопіса «Нёман», убачыў маю ўзбуджанасць і падабраў, як той казаў, да душы ключык. Так падышоў, што я коратка пераказаў сюжэт, што ніколі не рабіў і не раблю. Ён выслухаў, па-добраму ўсміхнуўся, махнуў рукой, сказаў:

— Назва ёсць, «Нелюбімыя гінуць» — якраз да твайго рамана.

Я разумеў, што Алесь Аляксандравіч аддае нешта са свайго, яшчэ ненапісанага, і не памыліўся. Ён пераказаў армейскі выпадак, што здарыўся падчас яго службы ў войску (здарэнне і цяпер памятаю да дробязяў). Трагедыя адбылася, і вінаватае было неразздзеленае каханне. Яшчэ раз хачу сказаць Алесю Аляксандравічу вялікі дзякуй.

Працяг рамана «Нелюбімыя гінуць» — ужо ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

***— Ваша дачка — вядомы тэатральны мастак. Адкуль цікавасць да выяўленчага мастацтва, у сям'і нехта маляваў?***

— Мая дачушка Валянціна Праўдзіна — сапраўды вядомы тэатральны мастак, і здольнасці да выяўленчага мастацтва, хутчэй за ўсё, у яе ад дзядулі, майго бацькі. Я не бачыў, каб ён нешта ці некага маляваў на паперы, а вось на пяску, калі, здаралася, былі на рыбалцы, імгненна мог з'явіцца малюнак чалавека, найчасцей мяне.

***— Ці адразу пачалі пісаць на беларускай мове? Ці праўда, што мова — жывая стыхія са сваёй ментальнасцю, якая ўплывае на таго, хто ёю карыстаецца?***

— Не, не адразу. Па абавязку службы мне даводзілася пісаць розныя заметкі прафілактычнага характару ў газеты. Часцей — у газету завода імя Вавілава і, зразумела, на рускай мове. Пісаў нешта і для сябе. Пра гэта даведаўся мой сябра, мастак Віктар Альшэўскі, і параіў пісаць на беларускай мове. Я паспрабаваў... і зацягнула... і быў шчаслівы... З'явіліся першыя апавяданні. Віктар Альшэўскі і Фелікс Янушкевіч амаль сілком адвялі мяне ў рэдакцыю часопіса «Маладосць», і я са сваімі пробамі пяра трапіў у надзейныя рукі Уладзіміра Максімавіча Дамашэвіча. У сярэдзіне васьмідзясятых убачылі свет першыя апавяданні, а яшчэ раней была надрукавана гумарэска ў газеце «Звязда».

***— У вашым рамане «Эксгумацыя» апошняе слова — «Рызыкнём». І героі, дамагаючыся справядлівасці, сапраўды часта рызыкуюць... Гэта і ваша жыццёвая пазіцыя?***

— Справядлівасць і рызыка, на мой погляд, рэчы зусім рознага ўжытку і ў пэўных сітуацыях нават несумяшчальныя. Рызыка сугучная з авантурызмам... Авантурай жа, як вядома, дамагчыся справядлівасці немагчыма. А калі раптам і паспрабаваць нешта вырашыць, і нават дабіцца пэўнай мэты — гэта ўжо не справядлівасць.

— Я ведаю, што ў вас быў досвед напісання постмадэрнісцкіх твораў... Чаму адважыліся і як расцэньваеце падобныя эксперыменты?

— Часткова адказаў на гэтае пытанне, але мушу сказаць: мы ўсё жыццё ў пошуку, і спробы новага — як глыток паветра... Здараецца — не надта свежага.

***— Вы любіце родную Шаркаўшчыну, яна для вас яшчэ і святая мясціна, дзе захоўваецца памяць пра свяшчэннамучаніка Канстанціна Жданава.***

— Нарадзіўся я ў гарадзе Ліда, дзяцінства прайшло ў саўгасе Гарадзец Шаркаўчынскага раёна, юнацтва — у самой Шаркаўшчыне. Мясціны старажытныя і вельмі дарагія майму сэрцу. Ёсць яшчэ вёска Панфілаўшчына Глыбоцкага раёна, дзе большую частку дзён у годзе і знаходжуся. Пра гэтыя месцы шмат напісаў, і калі чытачу цікава, лепш пачытаць кнігу «Іду насустрач...», а таксама апавяданне «Трыццаць міль да святасці», якое будзе надрукавана ў часопісе «Полымя» ў № 8. Гэты аповед пра святара Канстанціна Жданава, першага навамучаніка зямлі беларускай.

***— У вас з'явіўся ўласны сайт, цікавы па дызайне... Хто ім займаецца?***

— На апошні дзень нараджэння дзеці падарылі сайт. Што з ім рабіць — пакуль не ведаю, але разумею, што хутка інтэрнэт поўнасцю ўвойдзе ў маё жыццё.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Неасабісты суб'ектыў



# УПУШЧАНЫ МОМАНТ,

## або Чаго Варвара Пятроўна не даравала Сцяпану Трафімавічу

АБ'ЕКТЫЎНУЮ праўду аб уласным узросце даведваешся тады, калі нечакана для сябе робіш выснову, што самая пранізлівая інтымная сцэна ў літаратуры — гэта Варвара Стаўрогіна, якая гаворыць Сцяпану Верхавенскаму: «Я ніколі вам гэтага не забуду!»

Яно так і ёсць. Пакуль малады — лічыш, што найлепшае з «любоўнай лірыкі» — штосьці ўзнёсла-рамантычнае, караткевічава «Чазенія», напрыклад. Але надыходзіць момант, калі, дачытаўшы тую аповесць у чарговы раз, ты ўжо не верыш, як раней, што Ён Яе знойдзе. Ты нават ужо ведаеш, што можа быць у жыцці зусім наадварот. Ты ўжо дарослы, ты ўжо разумееш пра ўпушчаныя магчымасці. І героі Дастаеўскага, якія яшчэ, вядома, не твае равеснікі, але ўжо і не нашмат старэйшыя, становяцца раптам блізкія і зразумелыя. І ты ўжо абсалютна разумееш злосць і адчай Варвары Пятроўны, калі ў квітнеючым садзе моўчкі сядзіць яе апошняя надзея на жаночае шчасце. Сядзіць і маўчыць аб галоўным, ніякавата сёрбае чаёк, хоць і сам думае пра тое ж — пра тое, што нядрэнна было б... Але так нічога і не гаворыць, мо не асмельваецца, мо спадзяецца, што будзе іншы выпадак. А выпадку больш не будзе, і ўвогуле ўжо нічога не будзе, бо момант упушчаны, бо Варвара Пятроўна ўжо гэта зразумела і сама, каб не мучыцца і не мучаць больш, злосным шэптам паставіла кропку: «Я ніколі вам гэтага не забуду!»...

ПРА нявыкарыстаныя магчымасці і ўпушчаныя моманты чамусьці лепш за ўсё разважаецца і ўсведамляецца на зыходзе лета. Можа, таму, што пралятае яно надзвычай хутка — здаецца, зусім нядаўна рабіны сталі ў жаўтаватым вэлюме кветак, а вось цяжкія гронкі, ужо нечакана аранжавыя, цягнуць галіны да зямлі. А ты стаіш як ачмурэлы ў халаднаватым надвячорку, які нечакана, раптам перасунуўся на гадзіну раней, глядзіш на тое хараство і думаеш: а лета, лета — дзе? Столькі няздзейсненага, неадчутага, несказанага. Нават сукенкі летнія не ўсе хоць бы раз надзетыя. І не адзенеш іх ужо сёлета — прайшла гарачыня. Хіба на наступны год...

А на наступны год будзе тое самае. І толькі зачапіўшыся вокам за нечакана спелыя ягады ў ранніх халаднаватых прыцемках або пачуўшы ў навушніках «Следам за намі бяжыць лета, якое мы зноў змарнавалі», спынішся. І са шкадаваннем падумаеш пра несустрэтыя світанні, несабраныя ягады, непачутых птушак, няздзейсненыя падарожжы. Пра людзей, цікавых табе і цікаўных да цябе, якія толькі спыніліся ў жыцці мімаходзь, — а маглі ж і затрымацца, і, пэўна, усё было б па-іншаму і было б лепш, і быў жа момант, калі ўсё гэта магло спраўдзіцца. Пра нявыкананыя абяцанні, пра нявыказаныя словы, пра нявыяўленую пяшчоту і неагучаныя прызнанні...

«ПАСЛЯ, — супакойваем сябе, бы не ўласнае жыццё пражываем, а ягоны чарнавік пішам. — Вось на наступны год абавязкова». І так адзін год, другі, трэці... А пасля... Нязношаныя сукенкі выходзяць з моды, ад туфляў на абцасах баляць ногі — гэта калісьці ў іх можна было танцаваць, але ж не да танцаў было. Лес, дзе ягады і птушкі, зарастае і становіцца незнаёмы і страшны, а з кожным годам — усё больш і больш недасяжны. Слаўтыя мясціны, якія марыў (і мог!) наведаць, гінуць у пажарах ці землятрусах або апынаюцца за закрытай граніцай. Людзі, якія ішлі міма, спыніліся каля іншых людзей, і ім хораша з тымі іншымі (але ж з табой — і табе! — пэўна, было б лепш). Недададзеныя пацалункі і абдымкі, нявыкананыя абяцанні самым дарагім людзям такімі і застаюцца назаўжды, бо дарагія людзі паміраюць, і ты застаешся сам-насам з гэтай цяжэзнай ношай. І яна праз гады не стане лягчэйшая, яна — на ўсё астатняе жыццё, бо нікуды яе не скінуць, нікому яе не перадаць... І нечакана ловіш сябе на тым, што зусім не верыш у шчаслівы фінал «Чазеніі» і вельмі добра раптам пачынаеш разумець злосць і роспач Варвары Пятроўны на бяскрыўднага і бяздзейнага Сцяпана Трафімавіча.

ДАРЭЧЫ, я вось падумала: а калі б гэты літаратурны герой у той, такой жыццёвай, такой знаёмай многім сітуацыі, павёў сябе інакш? Калі б адважыўся, прызнаўся б у сваіх калі не пачуццях, дык высакародных намерах? Наколькі ўсё з імі дваімі, дый з іншымі персанажамі, было б інакш... Ну, тады б гэта не былі «Бесы» і не быў бы Дастаеўскі.

Але ж у жыцці хочацца, каб было шчасліва, а не па Дастаеўскаму...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **СООО «Бивер Трейд», 211260, Витебская область, г. п. Шумилино, ул. Северная, 9** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| 793 | Прицеп лесовоза, BEFA BE 2P, гос. № А5545А | 9 747,24 |
| 794 | Прицеп лесовоза СМТ РТ12-20, гос. № 5282А-2 | 14 498,71 |
| 795 | Оцилиндровочный «Мастер ОЦ-550» | 15 591,43 |
| 796 | Набор шкафов и стол темно-коричневого цвета | 3 849,11 |
| 797 | Набор мебели «Консул» 3+1+1 – красный цвет | 2 232,98 |

**расположенные по адресу:**
Витебская обл., Шумилинский р-н, г. п. Шумилино

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель – ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 20.09.2021** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 20.09.2021** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок – 16.09.2021 до 17.00** на ЭТП ООО «**Расантехторг**» по адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ООО «ГлобоКарт», г. Минск, пл. Свободы, д. 17, пом. 734б** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| 798 | Детский электромобиль (6 штук) | 768,00 |
| 799 | Катамаран с электроприводом, солнечной батареей БМ 6695 и прицепом лодочным, гос. номер А1933-7(одноосный) | 17 470,00 |
| 800 | Аэрохокей (большой, напольный, стол игровой, б/у) и игровой «Футбол» (напольный, б/у) | 680,00 |

**расположенные по адресу:**
Минская область, г. Узда, пер. К. Маркса, 12

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель – ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 22.09.2021** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 22.09.2021** в 16.00.
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок: 17.09.2021 до 17.00** на ЭТП ООО «**Расантехторг**» по адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**

**Внеочередное общее собрание акционеров**

## ОАО «МинскСортСемОвощ»

***(220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1)***
**по решению наблюдательного совета Общества**
**состоится в очной форме 25 августа 2021 года**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О приобретении открытым акционерным обществом «МинскСортСемОвощ» принадлежащих государству (Республике Беларусь) акций ОАО «МинскСортСемОвощ».

**Место проведения собрания:** г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1 (актовый зал).

**Начало собрания:** 09 часов 00 минут.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 08 часов 30 минут до 08 часов 55 минут по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 09 часов 00 минут до 16 часов 00 минут в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 16 августа 2021 года, по адресу: г. Минск, ул. Кузьмы Минина, 21, корп. 1.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию на 14 августа 2021 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

***Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»***

УНП 600052664

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов: ликвидатор ООО «Промводснаб» –**
Частное предприятие «АПР-Консалт»; УНП 191377325; г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 50, корпус 1, пом. 4Н (кабинет 5 (первый этаж)), +375291258110, apr.consalt@gmail.com

**Продавец: ООО «Промводснаб»,**
220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 36, оф. 316, +375291258110.

**Лот № 1**

| Наименование | Ед. изме-рения | Коли-чество | Цена за ед., бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Клапан Clack 4600/1600 Chrono | шт. | 1 | 782,43 |
| Насос UPS 25-40 N 180 1x230V 50Hz 9H Сербия | шт. | 1 | 440,33 |
| Электронный блок управления насосом водоснабжения с частотным преобразователем COELBOSPEEDMANBC EASY MASTER 12MM | шт. | 1 | 684,00 |
| Баллон 10X44 синий с базой | шт. | 8 | 93,21 |
| Баллон 8X35 синий | шт. | 2 | 65,25 |
| Баллон 8X17 синий с базой | шт. | 2 | 33,80 |
| Дозатор промежуточный (корпус) с входным и выходным отверстием для системы очистки воды | шт. | 20 | 6,84 |
| Ключ U-образный | шт. | 10 | 1,13 |
| Ключ N-образный | шт. | 20 | 1,13 |
| Кронштейн настенный голубой | шт. | 20 | 0,59 |
| Нейтрализатор пластмассовый с входным и выходным отверстием COND | шт. | 5 | 26,85 |
| Солевой бак 72 л черный | шт. | 2 | 85,64 |
| Сорбент АС 0.7–1.4 (16 кг/28,3 л) Россия | л. | 46,4 | 0,98 |
| Сорбент АС 0.7–1.4 (16 кг/28,3 л) Россия | л. | 5,7 | 0,83 |
| Сорбент АС фр. 0,7–1,4 мм ($м^3$) | $м^3$ | 0,24 | 855,36 |
| Тест для измерения жесткости воды | шт. | 2 | 9,00 |
| Уголь активированный NWC 12x40 | кг. | 0,4 | 183,17 |
| Картридж полипропиленовый для жидкостного фильтра CPP 10 SX 25MCR | шт. | 10 | 2,93 |
| Картридж п/п для жидкостного фильтра FA 10 HOT SX5 25 MCR | шт. | 8 | 4,14 |
| Картридж п/п для жидкостного фильтра FA 10 SX5 25 MCR | шт. | 6 | 3,98 |
| Картридж-фильтр (активированный уголь) AIC ACTIVATED CARBON POST FILTER | шт. | 20 | 5,45 |
| Картрижд-фильтр (реминерализатор) AIM REMINERALIZER POST FILTER | шт. | 20 | 8,23 |
| Картридж п/п для жидкостного фильтра FA 25MCR S+CPP | шт. | 16 | 28,82 |
| Картридж фильтра обратного осмоса Dow Filmtec Membranes reverse Oswmosis Element BTW30-4040 | шт. | 2 | 280,13 |
| Катионит Cation HCR-S/S | меш. | 1,95 | 76,44 |
| Катионит Dowex HCR-S/S | меш. | 4 | 88,60 |
| Нейтрализатор пластмассовый | шт. | 3 | 21,80 |
| Емкость V-100, синий | шт. | 1 | 37,80 |

**Предмет торгов расположен по адресу**: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 50, корпус 1, пом. 4Н (кабинет 5 (первый этаж)).

**Начальная цена: 6 807,92 бел. руб.** (Шесть тысяч восемьсот семь бел. руб., 92 коп.), в т. ч. НДС (20 %) – 1 134,65 бел. руб. Задаток: 68,08 бел. руб. Шаг аукциона 5 %.

**Торги состоятся 24.08.2021 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 50, корпус 1, пом. 4Н (кабинет 5 (первый этаж)).

**Срок внесения задатка**: с 13.08.2021 по 23.08.2021. Задаток перечисляется на расчетный счет ООО «Промводснаб» BY85PJCB30120561430000000933 в ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X.

Назначение платежа: внесение задатка для участия в торгах, лот № 1.

**Ознакомление с предметом торгов** осуществляется в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 50, корпус 1, пом. 4Н (кабинет 5 (первый этаж)), по предварительному согласованию по тел. +375291258110.

*Извещение о проведении первых торгов по продаже имущества ООО «Промводснаб» было опубликовано в газете «Звязда» в № 128 от 08.07.2021 (стр. 11).*

**Заявление на участие в торгах в свободной форме с указанием полных реквизитов покупателя со всеми необходимыми документами направлять по адресу: 220039, г. Минск, ул. Брилевская, д. 14, а/я 249, ликвидатору – Частному предприятию «АПР-Консалт» (с 9.00 13.08.2021 по 18.00 23.08.2021).** К заявлению на участие в торгах прилагается документ, подтверждающий внесение суммы задатка, указанной в извещении, с отметкой банка, а также документы согласно п. 12 Положения, утв. пост. Совмина Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Участником, выигравшим торги, единственным участником аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в сумме, которая будет доведена до сведения участников торгов до начала их проведения.

В день проведения торгов участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов. Время регистрации: с 10.30 до 10.50. Результаты торгов оформляются протоколом в день их проведения. В случае если заявление на участие в торгах подано только одним участником или для участия в торгах не было подано ни одного заявления, торги признаются несостоявшимися и оформляется протокол о признании торгов несостоявшимися. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, оформляется протокол о продаже предмета торгов этому участнику. Срок подписания договора купли-продажи предмета торгов – 5 рабочих дней со дня проведения торгов, срок оплаты по вышеназванному договору – 15 рабочих дней с момента подписания договора».

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

## Государственное предприятие «МГЦН»

**26 августа 2021 года в 12.00**
проводит повторный открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, находящегося в государственной собственности (далее – имущество)

| Предмет аукциона (срок договора аренды, наименование, место нахождения недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион) | Пло-щадь, кв. м | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) |
|---|---|---|
| Помещения на 2-м и 3-м этажах здания, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 4-2. Договор аренды заключается сроком на 3 года | 584,0 | 2 467,40 |
| **Организатор аукциона** – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10 | | |
| **Срок и место приема заявлений:** с 11 августа 2021 г. по 24 августа 2021 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 | | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). | | |

**Телефон для справок** +375 (17) 360 42 22.

УНП 190398583

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ СООО «АРЭСА-СЕРВИС»,

***опубликованной в газете «Звязда» 22.09.2020 г.***
**«Многоэтажный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения № 43 по генплану и многоуровневой автостоянкой на 300 машино-мест № 39 по генплану по ул. Р. Люксембург» (1-я очередь строительства) в г. Минске.**

*Сроки реализации строительства первой очереди*:
начало строительства – сентябрь 2020 г.;
завершение строительства – 15 мая 2022 г.

*Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства:* однокомнатных – 35 квартир; двухкомнатных – 54 квартиры; трехкомнатных – 36 квартир.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, корпус 4, кабинет 507; тел.: 8 (017) 269-31-00; +375 29 110 68 68, режим работы по вопросам долевого строительства: пн.–пт. 9.00–13.00; 13.45–17.45.
Сайт СООО «АРЭСА-СЕРВИС»: www.garmonia-dom.by, aresa-service.by.

УНП 100154752

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1825231, 1825232, 1830287, 1845513, 1852460.

УНП 100782388

# ЛЮДЗІ І ПТУШКІ



## Як першыя дапамагаюць другім і пры гэтым змяняюцца самі

**Гэтым летам я даведалася пра людзей шмат новага. І спярша — пра сябе. Атрымалася гэта дзякуючы сустрэчы з маленькай істотай вагой 13,5 грама. Столькі важыла дарослая ластаўка-зямлянка, якую ў бездапаможным стане падабраў муж на паркоўцы сталічнага рынку «Ждановічы»: складаны пералом крыла.**



Марына СЕРАБРАКОВА.

У прыватнасці, даведалася, што ў Беларусі ёсць фермы па вырошчванні кармавых насякомых, і практычна ў любую мясціну іх могуць даставіць. А яшчэ — што людзей, якія падбіраюць траўмаваных або аслабелых птушак, не так і мала. Сёлета адных толькі стрыжанят выратоўвала больш за 500 чалавек. І большасць з іх, як і я, не падазравала, што будуць гатовыя гадзінамі шукаць у інтэрнэце інфармацыю пра асаблівасці рацыёну насякомаедных, не спаць начамі і цалкам адкінуць гідлівасць да гіганцкіх тараканаў... Інакш кажучы, будуць гатовыя на ўсё, каб дапамагчы нябесным стварэнням, якія строгім позіркам зазіраюць у самую глыб неспакойнай чалавечай душы.

Гэта ўсё пра тых, хто ўпершыню сутыкнуўся з жыхаром неба, які апынуўся на зямлі. Аказалася, ёсць беларусы, што ратуюць крылатых братоў нашых меншых на працягу многіх гадоў. Яны праходзяць розныя стадыі: ад суцэльнага самаахвяравання да супрацьўлення і спроб выбудаваць межы, але ўжо не могуць жыць без той невытлумачальнай сувязі з птушкамі. Гэты аповед — пра тое, як птушкі ўваходзяць у жыццё людзей, і пра тое, што атрымліваецца пасля.

### Марына: «Часта наша дапамога не патрэбная»

Першая птушка ў жыцці **фатографа і бёрдвотчара Марыны СЕРАБРАКОВАЙ** з'явілася ў 16 гадоў — хвалісты папугай. Ужо тады дзяўчына зразумела, што гэта паўнацэнны член сям'і, у якога ёсць характар, пэўны тэмперамент, якому патрэбныя ўвага і адмысловае харчаванне.

Гадоў праз пяць яна падабрала грака з паламаным крылом. Марына стала шукаць інфармацыю па доглядзе дзікіх птушкі, бо з ёй было ўсё інакш. «Дзікія птушкі непрыстасаваныя да жыцця ў кватэры, да суіснавання з чалавекам: ён для іх — вораг, і ўся сітуацыя — стрэс», — кажа бёрдвотчар.

Знайсці агульную мову з гракам дапамаглі вывучэнне зоапсіхалогіі, цярпенне і час — на ўсё спатрэбілася паўгода.

Марына называе дзве істотныя праблемы, з якімі некалі сутыкнулася: «У 2010-х гадах у Беларусі немагчыма было знайсці ветэрынараў — арнітолагаў з вопытам. На дзяржаўнай ветэрынарнай станцыі грака зблыталі з варонай. Другая праблема — адносіны людзей, якія жывуць разам з табой, да акалічнасцяў знаходжання дзікай птушкі ў кватэры». Напрыклад, грак, калі асвоіўся, стаў спяваць, і любіў сустракаць сваёй песняй світанне.

«Потым пайшло-паехала», — коратка апісвае жыццё пасля сустрэчы з гракам Марына. З таго часу ў яе жылі дзясяткі дзікіх птушак розных відаў. Самыя шчаслівыя гісторыі — калі крылатага кватаранта ўдаецца вярнуць у дзікую прыроду. Але не менш натхняльныя і тыя, дзе птушка выкараскваецца з кіпцюроў смерці і становіцца сябрам чалавеку.

Марыне ніколі не забыць, як, здавалася, безнадзейна траўмаваны канюк — драпежнік з размахам крылаў больш за метр — змагаўся за жыццё. «Вельмі кранальна было назіраць спробы птушкі станавіцца на лапы. Спачатку магла стаяць секунду, але з кожным днём дадавалася яшчэ трохі часу, потым яна стала спрабаваць рухаць лапамі, нарэшце, зрабіла пару крокаў», — з пяшчотай успамінае суразмоўніца.

Марына адмовілася купляць жывёлін у зоамагазінах, бо лічыць, што тых, каму патрэбна наша дапамога, — вельмі шмат проста на вуліцы. Сёння ў Марыны жывуць хвалісты папугай, які згубіў свой дом, палявы верабей і шэрая варона. Верабей трапіў да яе птушанём, пазней захварэў і за час лячэння стаў ручны.

«Цяпер гэта самае ласкавае, пяшчотнае «кацяня», і я нават не ўяўляю, як жыла без яго, — прызнаецца Марына. — Ён прылятае на плячо або руку, «расплываецца» або папраўляе мае валасы, размаўляе, адбірае ежу...»

У кожнага валанцёра і бёрдвотчара ёсць свае любімыя віды птушак. «З маёй шэрай варонай сапраўды цікава. Яна ўвесь час развіваецца, вучыцца нечаму новаму. Яшчэ яна надзвычай прыгожая», — расказвае Марына пра сваю любіміцу.

У гэтым сезоне Марына даглядала галубяня і шэрага дразда. Голуб вернуты ў прыроду, дрозд рыхтуецца да вылету на волю ў разлётным вальеры рэабілітацыйнага цэнтра «Сірын».

Марына мяркуе, што ў Беларусі каля 20 валанцёраў, якія маюць дастатковы вопыт абыходжання з дзікімі птушкамі. Кожны з іх не толькі сам даглядае і лечыць крылатых, але і курыруе ад дзясятка да некалькіх соцень чалавек, якія выходжваюць птушыных гадаванцаў.

Тым, хто ўпершыню падабраў птушку альбо збіраецца гэта зрабіць, Марына раіць перш-наперш звярнуцца ў грамадскую арганізацыю «Ахова птушак Бацькаўшчыны»: там праінструктуюць, як не парушыць закон, падкажуць, да каго звярнуцца па кансультацыю. Пры гэтым трэба разумець, што ў Беларусі няма прытулкаў для птушак-інвалідаў, няма цэнтраў, дзе птушак лечаць, і дагэтуль вельмі мала ветэрынараў-арнітолагаў.

Часта птушкам увогуле непатрэбная наша дапамога — лепш прайсці міма. Так бывае з подлеткамі — птушанятамі, якія вучацца лётаць, і якіх дакормліваюць бацькі пасля вылету з гнязда (выключэнне — стрыжы і галубы). Яшчэ адна памылка людзей — кармленне вадаплаўных птушак. Бёрдвотчар падкрэслівае: любых падкормліваць трэба, толькі калі ўстанавіліся маразы, ніжэйшыя за 10 градусаў. Пры гэтым нельга карміць хлебам (можна кашай, геркулесам). Усё іншае — толькі на шкоду, нават на бяду для птушак.

### Кірыл: «Імкненне запоўніць прабел»

Першая птушка Кірыла Скіркоўскага — савянё. Гэта быў подлетак, якога нельга забіраць ад бацькоў, але знаёмы Кірыла з-пад Ліды пра тое не ведалі, час быў упушчаны. Юнак птушаня падкарміў і адправіў у расійскі спецыялізаваны цэнтр падрыхтоўкі дзікіх жывёл да жыцця ў прыродзе.

Наступны свой вопыт малады чалавек атрымаў у цэнтры рэабілітацыі дзікіх жывёлін пад Мінскам, дзе быў валанцёрам каля года. Пазней ён і яшчэ два аднадумцы аб'ядналіся ў каманду, каб стварыць уласны цэнтр рэабілітацыі дзікіх жывёлін, у тым ліку птушак. Пакуль задума на ўзроўні праекта, пошуку сродкаў і распрацоўкі сайта. Але назва ўжо ёсць: «Цэнтр рэабілітацыі дзікіх жывёл «НЕСС». У марах Кірыла — максімальна наблізіцца да найлепшых узораў расійскіх і еўрапейскіх аналагаў.

У Беларусі ёсць два месцы, куды можна аддаць дзікую птушку, — прытулак пад Асіповічамі і цэнтр рэабілітацыі дзікіх жывёлін «Сірын» пад Мінскам. Гэтага недастаткова, каб якасна дапамагчы ўсім тым, хто мае патрэбу.



Кірыл СКІРКОЎСКІ.

Кірыл кажа пра пляцоўку, дзе можна будзе аказваць першую дапамогу, лячыць, складаць рацыён, рыхтаваць да выпуску, выпускаць, адсочваць і весці статыстыку. «У нас не праводзяцца навуковыя даследаванні пра тое, як лепш рэабілітаваць, куды, калі, якім чынам выпускаць. Часта гэта робіцца наўздагад, — кажа ён. — На жаль, нашы ветэрынары не спецыялізуюцца на лячэнні дзікіх жывёлін».

Пра недахоп такіх спецыялістаў казалі ўсе мае суразмоўнікі. Ды і сама я сутыкнулася з гэтым.

Кірыл сёлета паступіў вучыцца на ветэрынара ў Маскву — там больш адпаведных профіляў.

### Аляксандра: «Зразумець іх мову»

Першая дзікая птушка **Аляксандры КРАСІЙ, лінгвіста і біёлага,** — галубка са зламаным крылом. Гэта было амаль 20 гадоў таму. Потым было дзіцяня сарокі і адкрыццё магчымасцяў кансультацыі на інтэрнэт-рэсурсе. Падабраная на школьнай экскурсіі ў Каменцы галка засталася кульгавая, але пражыла ў яе 10 гадоў. З таўстадзюба распачаўся вопыт выкормлівання птушыных дзяцей. З 2014 года ў Аляксандры жыве другая галка, якая ўмее прамаўляць тры фразы і адчыняць скрыначкі з хітрымі замкамі.

Праз 10 гадоў пасля заканчэння школы і праз некалькі гадоў пасля выпуску з лінгвістычнага універсітэта Аляксандра пры падтрымцы мужа ажыццявіла мару свайго дзяцінства — паступіла на біялагічны факультэт БДУ. Вучобу на дзённым аддзяленні сумяшчала з работай па першай спецыяльнасці: пасля занятказў садзілася за пераклад дакументаў.

«Атрыманыя веды па біялогіі дапамагаюць лепш бачыць сітуацыю, — кажа яна. — Але самае каштоўнае падчас вучобы — практыка. Я размеркавалася на кафедру «Заалогія», дзе ёсць выезды на навуковыя базы. Гэта шмат дало, бо з кніг ты ніколі не навучышся таму, што табе пакажа вопытны выкладчык у лесе».

Веды па лячэнні птушак валанцёр атрымлівае самастойна, і галоўны памочнік тут — вопыт. Кожная птушка з новай праблемай — нагода шукаць інфармацыю. Аляксандра з тых, каго не пужаюць складанасці. Свайго першага маленькага шчыгла яна вазіла на заняткі ва ўніверсітэт, каб не прапускаць гадзіны кармлення. Дыплом атрымлівала разам з голым яшчэ птушанём у сумцы. Ды і цяпер яна бярэ птушыных дзяцей з сабой у госці і вандроўкі. Са смехам расказвае пра леташняга вераб'я, якога хлопчык з невялікага гарадка падабраў і хаваў у шафе ад бацькоў. Верабей на ўсякі выпадак і ў Аляксандры таксама ўвесь час хаваўся: пад сурвэтку.

«Пліска, палявыя вераб'і, гіль, чыж... — пералічвае падапечных дзяўчына. — У вальер для разлёту аддаю толькі пасля таго як навучу іх самастойна харчавацца, у тым ліку лавіць жывых цвыркуноў». Сёлета яна гадавала 13 птушанят шпакоў і сем вераб'янят адначасова.

Паступова сітуацыя з дапамогай дзікім птушкам, якія трапілі ў бяду, у Беларусі змяняецца да лепшага, лічыць валанцёр. «Адна група ва «УКантакце» па стрыжах чаго вартая («Спасение стрижей в Беларуси (статьи)», сайт strizh.by, аўтар — Ніка Пужук. — **Аўт.**), там ёсць інструкцыі практычна на ўсе выпадкі, — радуецца яна. — Колькасць трагічных для птушкі памылак у спробах чалавека дапамагчы змяншаецца. Усё часцей людзі спачатку шукаюць інфармацыю, а ўжо потым спрабуюць накарміць сваю «знаходку». Звяртаюцца да валанцёраў па кансультацыю. Часцей удаецца папярэдзіць забіранне здаровых подлеткаў».

На жаль, з ветэрынарнай дапамогай прагрэс не такі відавочны. Напэўна, на гэта патрэбна больш часу, мяркуе Аляксандра. Да таго ж прапанова якаснай паслугі можа з'явіцца пры дастатковым попыце на яе.

Яшчэ адна станоўчая тэндэнцыя ў грамадстве: людзі, якія падабралі птушаня, але не могуць яго даглядаць з-за спецыфікі сваёй работы (наяўнасць у кватэры катоў і дзяцей — не аргумент, кажа Аляксандра, у якой ёсць два каты) аддаюць сваю знаходку валанцёру разам з кормам, потым цікавяцца лёсам гадаванца. У такіх выпадках яна запрашае апекуноў паўдзельнічаць у выпуску птушкі ў прыроду.

Сёлета Аляксандра пракансультавала некалькі дзясяткаў чалавек, якія падабралі дробных птушак. Непазбежная ў такой справе і прыкрасць: «На жаль, усё яшчэ сустракаецца дзве крайнасці. Звоняць і кажуць пра траўміраваную птушку: калі не прыедзеце, я яе выкіну! Або знаходзяць здаровага подлетка, падказваеш вярнуць назад, а ў адказ — як так, там жа кошкі! Ну і што? А ведаеце, колькі драпежнікаў у лесе?!»



Аляксандра КРАСІЙ.

Як сустрэча з дзікай птушкай змяняе чалавека? Дорыць іншы погляд на навакольны свет, лічыць валанцёр. Пачынаеш заўважаць гнёзды на дрэвах, чуць птушыныя спевы, бачыць іх у небе, адрозніваць галасы...

«Па сутнасці, птушкі — гэта іншая форма жыцця, настолькі яны адрозніваюцца ад нас, і калі ты пачынаеш разумець іх, эмоцыі перапаўняюць. Разам з тым, паміж людзьмі і птушкамі шмат агульнага, — дадае біёлаг. — Напрыклад, візуальнае ўспрыманне навакольнага свету».

Нарэшце, птушкі робяць чалавека больш спагадлівым і адказным. І з гэтым нельга не пагадзіцца.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 27 августа 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 20 % (лот № 1), на 30 % (лоты №№ 2, 4, 5), на 40 % (лоты №№ 3, 6) по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20%), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Продавца (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке:** лоты №№ 4, 5 расположены на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1)**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9 | | | |
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34611**, **площадью 2 759,7 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 7**. Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-7 | **263 899,42** | 13 194,97 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622**, площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14 | **712 861,66** | 35 643,08 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-34623**, площадью **35 167,2 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 15**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-15 | **2 027 520,00** | 101 376,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14327**, общей площадью **647,1 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на пять транспортных единиц с диспетчерской** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание гаража на пять транспортных единиц с пристроенной двухэтажной кирпичной диспетчерской) | **65 103,14** | 3 255,16 |
| 5 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-14328**, общей площадью **692,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц (**составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц**).** | **65 143,95** | 3 257,20 |
| 6 | **Изолированное помещение с инв. № 320/D-29357**, **площадью 4 857,2 кв. м**, назначение – административное помещение, наименование – **административно-управленческий корпус с залом собраний**. Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2-1 | **491 952,34** | 24 597,62 |

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07 – заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 августа 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 августа 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.**

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату за услуги (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 29.05.2021 г. № 100 (29469). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

## ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ»

